Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛІПЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 143 (28253)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Сямейная газета



Як даглядаць бараду?



У адпачынак — з дзецьмі



«Моцны арэшак» адпачывае

СТАР. 16

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Кандыдатам, якія вылучаюцца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, неабходна прадастаўляць усе магчымасці — і рабіць гэта прафесійна — для раскрыцця іх праграмных заяў, якія, я ўпэўнены, будуць якасна прапрацаваны і самімі кандыдатамі, і іх камандамі. І магчымасці гэтыя павінны быць роўнымі для кожнага кандыдата».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9943 | ▲ |
| Еўра | 2,1934 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0302 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0803 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

16143

9 771990 763008

# Каму колас кланяецца




Жніво на хлебных палетках у КСУП «Чырвонабярэжскае» Жлобінскага раёна ў самым разгары. Механізаваны атрад з сямі камбайнаў за дзень намалочвае паўтысячы тон збожжа. Са збожжавых плошчаў гаспадаркі — 1200 гектараў — убрана болей за 3250 тон азімай пшаніцы і трыцікале. На ўчарашні дзень гаспадарка прадала дзяржаве амаль 600 тон новага хлеба.

Лідарам жніва сельгаспрадпрыемства ў гэтыя дні стаў экіпаж **братоў Юрыя і Сяргея КАЗАКОЎ** *(на фота)*. Старэйшы брат Юрый на сваім «Палессі-12» неаднаразова займаў вядучыя пазіцыі на жніве ў раёне і вобласці, удзельнічаў у рэспубліканскіх «Дажынках». Механізатар кажа, што з 9-га класа задзейнічаны ва ўборцы. Сёння Юрыю Казаку 45 гадоў. На гэтым жніве браты ўжо намалацілі амаль 800 тон збожжа.

Дзясятае жніво на прафесіянальнай ніве ў **начальніка вытворчага ўчастка «Чырвоны Бераг» Ганны БІЛОТАС** *(на фота)*. Гэта на яе хлебным полі ідзе бітва за ўраджай. 35 цэнтнераў і болей з гектара дае поле.

На гэтым жа гарачым полі працуе і майстар сваёй справы **кіроўца «МАЗа» Міхаіл СЕНАЖЭНСКІ** *(на фота)*, які ў «Чырвонабярэжскім» таксама болей за трыццаць гадоў. Сёлета Міхаіл Казіміравіч паспеў адвесці на зернесушылку 1300 тон новага ўраджаю і з'яўляецца лідарам у раёне на жніве.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Жлобінскі раён.*

**Болей фота глядзіце на партале «Звязды».**





■ Жыллё маё

# Адчыніце, да вас капрамонт!

## На што можна разлічваць пры планавай мадэрнізацыі дома



**Перанесці апорную сцяну ў сваёй кватэры, выкапаць падвал пад балконам першага паверха, замяніць газавую пліту электрычнай закон уласнікам жылля не забараняе — пры ўмове атрымання спецыяльнага тэхпраекта, які засведчыць, што перабудовы не пашкодзяць будынку і камунікацыям у ім. Аднак замяняць стаякі з вадою самымі наваноднымі, але не прадугледжанымі праектам трубамі, павялічваць колькасць рабрын у батарэі або ставіць на даху спадарожнікавую талерку не дазваляецца. Капітальны рамонт можа быць самастойным ці планавым. У першым выпадку — гэта асабістае рашэнне ўладальніка палепшыць якасці кватэры, у другім — абнаўленне ўсяго будынка за кошт адлічаных сродкаў. Аднак пры гэтым не ўсе паслугі, якія будуць выкананы падчас агульнага капрамонту, акажуцца для жыхароў бясплатнымі.**

### ДАДАТКОВЫЯ РАБОТЫ Ў КВАТЭРЫ — ЗА СВОЙ КОШТ

Калі да дома даходзіць чарга, супрацоўнікі жыллёвай службы выбарачна абыходзяць некалькі кватэр у ім, каб уявіць, што прыйдзецца рабіць падчас капрамонту. Зыходзячы з убачанага, спецыялісты складваюць агульнае рашэнне па каштарысе прац, аднолькавае для ўсіх кватэр.

Калі ўзнікне патрэба ў дадатковых работах (накшталт абабіць плітку са сцяны ці разламаць нішу ў санвузле, якую зрабілі самі жыхары, а не рабочыя, бо немагчыма трапіць да трубапровада), уладальнік павінен сам вырашыць гэтую праблему або аплаціць паслугі спецыялістаў.

СТАР. 4

■ Людзі

# ПЛЮС 1,5 ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК

## Колькасць насельніцтва Беларусі вырасла з пачатку года

**Цяпер у краіне пражывае 9,5 мільёна чалавек, што на 1590 чалавек больш, чым было ў студзені.**

Асноўная прычына павелічэння насельніцтва — міграцыйны прырост. За першае паўгоддзе замежнікаў у Беларусі стала больш на 4,6 тысячы. У асноўным да нас пераязджаюць грамадзяне СНД. З пачатку года з краін садружнасці ў рэспубліку прыбыла 7,7 тысячы чалавек, з іх 87 працэнтаў — жыхары Расіі, Казахстана і Украіны.

Натуральнае змяншэнне насельніцтва за першае паўгоддзе склала 3031 чалавек, што ў два разы менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Са студзеня па чэрвень у Беларусі нарадзілася амаль 58,3 тысячы дзяцей. Гэта на тры працэнты больш, чым за леташні паўгода. У параўнанні са студзенем—чэрвенем 2015-га знізілася таксама колькасць памерлых — на 1329 чалавек.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*lubneuskaya@zviazda.by*

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — МЯЖА

**Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях дзейнасці органаў пагранічнай службы, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА. Прэзідэнт заявіў, што не задаволены станам асобных напрамкаў дзейнасці Дзяржпагранкамітэта.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што па яго даручэнні нядаўна была праведзена раптоўная праверка дзейнасці органаў пагранслужбы і яе вынікі сталі прадметам абмеркавання на нарадзе. «Мне былі даложаны вынікі гэтай раптоўнай праверкі. Было некалькі меркаванняў. Трэба разабрацца. Каму трэба — падзякаваць, каго трэба — пакараць. Я не стаў гэтага рабіць кулуарна. Размова павінна быць прынцыповай, мы людзі ваенныя. Тым больш некаторыя факты гэтай праверкі мяне сур'ёзна насцярожваюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што толькі сёлета на ўзроўні Прэзідэнта да пытанняў пагранічнай бяспекі звяртаюцца трэці раз. «Гэта азначае, што ёсць не проста насцярожанасць, а, шчыра кажучы, глыбокае незадавальненне станам асобных напрамкаў у дзейнасці Дзяржпагранкамітэта, — заявіў беларускі лідар. — Паколькі ў нас транзітная краіна (мяжа набывае вельмі сур'ёзнае значэнне), мы адмахнуцца ад гэтых пытанняў не можам».

«Пытанне не ў тым, каб падзякаваць або пакараць. Яно ў тым, каб пасля гэтага было лепш на граніцы. А тое, што будзе лепш, я ў гэтым не сумняваюся. Скажу па-мужчынску: з вамі або без вас (пытанне толькі ў гэтым), але будзе лепш. Мы не можам дазволіць сабе ўтрымліваць такую колькасць пагранічнікаў і мець праблемы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

■ Ва ўрадзе

## СТВАРЫЛІ НА 90% ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ БОЛЬШ

**Паводле слоў прэм'ер-міністра Андрэя КАБЯКОВА, план па стварэнні новых працоўных месцаў у першым квартале сёлета перавыкананы на 90%.**

Са студзеня па сакавік у краіне было запланавана стварэнне працоўных месцаў для 8320 чалавек, а на выніках працаўладкаваны 15 824. «Не забяспечылі выкананне задання ў першым квартале канцэрн «Белнафтахім», Гродзенскі, Мінскі і Магілёўскі аблвыканкамы», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Усяго, згодна з указам №78, у краіне пастаўлена задача па штогадовым стварэнні не менш як 50 тысяч працоўных месцаў і працаўладкаванні на іх грамадзян.

«Нягледзячы на перавыкананне плана амаль у два разы, інфармацыя, якая паступае ва ўрад, сведчыць аб захаванні сацыяльнай напружанасці ў шэрагу працоўных калектываў, якая выклікана няпоўнай занятасцю, асабліва ў арганізацыях прамысловасці і будаўніцтва», — растлумачыў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, найбольш відавочная прычына крыецца ў якасных характарыстыках створаных працоўных месцаў.

«Каб вырашыць праблему занятасці, неабходна ствараць высокаэфектыўныя і запатрабаваныя працоўныя месцы, якія сапраўды патрэбны арганізацыям і не стануць для іх пасля своеасаблівым баластам. Выкананне даручэння кіраўніка дзяржавы па стварэнні 50 тысяч новых працоўных месцаў не павінна рэалізоўвацца за кошт іншых захадаў па павышэнні эфектыўнасці работы прадпрыемстваў», — растлумачыў прэм'ер-міністр.

Акрамя таго, ён падкрэсліў, што Мінпрацы і сацабароны сумесна з Мінэканомікі, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам было даручана правесці адпаведны аналіз якасці працоўных месцаў, у тым ліку з наведваннем прадпрыемстваў. Таксама важным пытаннем з'яўляецца дакладнасць той інфармацыі, якая прадастаўляецца аб колькасці працаўладкаваных грамадзян на новыя працоўныя месцы. Андрэй Кабякоў лічыць, што неабходна ўважліва разгледзець атрыманыя вынікі.

Па інфармацыі **першага намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэя ЛАБОВІЧА**, узровень рэгістраванага беспрацоўя ў Беларусі на 1 ліпеня склаў 1,1%. У апошнія два месяцы назіраецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці беспрацоўных, якія рэгіструюцца. Калі ў маі іх было больш за 53 тысячы, то на 1 ліпеня гэтая лічба зменшылася да 47 тысяч чалавек. Таксама паводле яго слоў, у першым квартале сёлета ў Беларусі больш за 60% працоўных месцаў створаны на прадпрыемствах прыватнай формы ўласнасці. Вакансіі з'яўляліся ў прамысловасці, гандлі, сферы інфармацыйных тэхналогій, аказання паслуг. На новыя прадпрыемствы працаўладкавана звыш 9 тысяч чалавек. Больш за ўсё працоўных месцаў створана ў Мінску.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела кадраў і спецработы Дзямідавай Інесе Яўгенаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесара Міхаіла Іванавіча ДЗЕМЧУКА і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Рэспубліканскі Савет Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім заўчасна памерлага Міхаіла Іванавіча ДЗЕМЧУКА.**

■ Выбары-2016

## Падтрымаць патэнцыйнага кандыдата

**Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (РППС) стала лідарам сярод палітычных партый Беларусі па колькасці прадстаўнікоў, вылучаных ва ўчастковыя выбаркамы — 1 141 чалавек. Партыя таксама вылучыла 23 патэнцыйныя кандыдаты ў дэпутаты. Карэспандэнт «Звязды» наведаў адзін з пікетаў РППС па зборы подпісаў у іх падтрымку.**

На гадзінніку 10 раніцы, застаецца 46 дзён да выбараў, і члены ініцыятыўнай групы **патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігара КАМАРОЎСКАГА** ўжо стаяць пад сцягамі на адным з месцаў правядзення пікетаў.

«Усё выдатна, да працы гатовыя, толькі б сонца схавалася ненадоўга», — panaракала на надвор'е адна з удзельніц ініцыятыўнай групы.

Усяго ў камандзе Ігара Камароўскага 101 чалавек. Большасць з іх пазменна задзейнічаны ў зборы подпісаў на пяці пікетах 98-й выбарчай акругі.

«Калі людзі падыходзяць, яны ў асноўным цікавяцца тым, хто праводзіць пікет, асобай і біяграфіяй прэтэндэнта ў кандыдаты. Некаторыя нават ужо накіроўваюць свае праблемныя звароты. На гэты момант мы сабралі каля 4 тысяч подпісаў», — распавёў патэнцыйны кандыдат у дэпутаты.

Ён растлумачыў, што пікеты геаграфічна стараліся размясціць у тых месцах, дзе найбольшы рух людзей, як правіла, каля гандлёвых пунктаў. Стаяць там зранку і ўвечары, без перапынку на выхадныя, каб кожны ахвотны мог падпісацца ў найбольш зручны для яго час.

Аднак знайсці канкрэтнага магчымага кандыдата, каб падпісацца за яго ўдзел у выбарах па Мінску — задача няпростая. Інтэрнэт, на які я вельмі спадзяюся як на самую даступную крыніцу інфармацыі, у гэты раз не дапамог. Каб знайсці месца збору подпісаў за пэўнага чалавека, трэба даведацца, ад якой акругі ён будзе вылучацца, і абысці ўсе самастойна, арыентуючыся на найбольш ажыўленыя месцы. Хутчэй атрымаць неабходную інфармацыю аб месцазнаходжанні пікетаў магчыма праз партыю патэнцыйнага кандыдата, якая яго вылучае. Больш складана, калі ўдзельнік перадвыбарчай гонкі беспартыйны.

* * *

**У Гродзенскую абласную выбарчую камісію не паступала скаргаў, звязаных з правядзеннем пікетаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у дэпутаты парламента. Акруговыя камісіі таксама не паведамлялі аб наяўнасці зваротаў па той ці іншай канфліктнай сітуацыі. Такім чынам, усе, хто палічыў неабходным, маглі скарыстацца сваім правам на пікетаванне. Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміў сакратар Гродзенскай абласной выбарчай камісіі Павел МІХАЛЮК.**



Фота БЕЛТА.

Паводле інфармацыі **намесніка старшыні Гродзенскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Георгія ХАМУЦІННІКА**, пікеты праводзяцца і ў абласным, і ў раённых цэнтрах. Гэтая форма збору подпісаў выкарыстоўваецца даволі актыўна, аднак за колькасцю пікетаў ніхто не ганіцца. Лічыш патрэбным — праводзь пікет. Альбо рабі ўпор на не менш, а можа, і больш эфектыўную форму кантакту з выбаршчыкамі — іх пакватэрны абход. Напрыклад, да аўтара гэтых радкоў прыходзілі ўжо двойчы, і магу адзначыць, што члены ініцыятыўных груп строга кіраваліся нормамі заканадаўства.

Гэта тычыцца і правядзення пікетаў. Не зарэгістравана фактаў, каб на гэтым этапе выбарчай кампаніі раздаваліся агітацыйныя матэрыялы; члены ініцыятыўных групы маюць адпаведныя пасведчанні. А многія выбаршчыкі, калі з сабой ёсць пашпарт, не адмаўляюць у прапанове падтрымаць ахвотнікаў паўдзельнічаць у барацьбе за дэпутацкі мандат. Як гэта было падчас пікета, які актывісты «Белай Русі» правялі ў Ваўкавыску каля ўніверсама «Аэліта Люкс». Гараджане рознага ўзросту падыходзілі да рэгістрацыйнай стойкі, задавалі пытанні прадстаўнікам ініцыятыўнай групы. Было відаць, што яны добра валодаюць інфармацыяй аб маючых адбыцца парламенцкіх выбарах.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Пра гэта гаварылася на Народным сходзе

## АСНОВА ПОСПЕХУ — ЧАЛАВЕК

**Валянцін БАЙКО, заснавальнік СТАА «Контэ СПА»:**



— 20 гадоў таму я сумесна з бацькам, братам і яшчэ некалькімі партнёрамі стварыў кампанію «Контэ». Нашы першыя інвестыцыі — 20 000 нямецкіх марак — практычна ўсе сямейныя зберажэнні, на якія мы купілі першыя два станкі. Мінула 20 гадоў карпатлівай, штодзённай працы. Сёння кампанія «Контэ» — гэта найбуйнейшы ў краіне вытворца панчошна-шкарпэтачных вырабаў, які выпускае ў год больш як 100 мільёнаў вырабаў. Больш за 4 тысячы чалавек працуюць на кампанію ў 5 краінах. Толькі ў Гродне мы далі людзям 2120 працоўных месцаў.

70% нашай прадукцыі пастаўляецца на экспарт у 20 краін свету, дзе яна прадаецца, паводле нашых падлікаў, у 40 000 гандлёвых пунктах. За апошнія пяць гадоў мы экспартавалі прадукцыі на паўмільярда долараў ЗША, прычым маем 236 мільёнаў долараў дадатнага сальда. За гэты ж час інвесціцыі ў нашу краіну склалі 118 мільёнаў долараў, у тым ліку больш як 70 мільёнаў выкарыстана на развіццё вытворчасці.

Я ганаруся поспехамі кампаніі і яе працоўнага калектыву. Пачаўшы амаль з нуля і за 20 гадоў стварыўшы вядомы брэнд, пабудаваўшы самую буйную на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы фабрыку, мы даказалі, што ўмовы для развіцця бізнесу ў Беларусі ёсць.

Мы змаглі развіцца і вырасці, таму што, акрамя многіх іншых фактараў, была выбрана лінія на пабудову празрыстага ва ўсіх адносінах бізнесу. У нас празрыстыя адносіны з пастаўшчыкамі сыравіны і пакупнікамі. Мы адкрыта будуем стасункі ўнутры калектыву і з любымі людзьмі, з кім даводзіцца сутыкацца па рабоце. Мы сумленна плацім падаткі і выконваем законы.

Мы разумеем, што аснова — гэта чалавек. І ў развіццё чалавечага патэнцыялу ўкладваем сілы і сродкі. Для многіх маладых людзей месца ў нашай кампаніі і ёсць іх першае працоўнае месца. Для замацавання работнікаў на прадпрыемстве і стварэння спрыяльных умоў працы супрацоўнічаем з прафесійнымі навучальнымі ўстановамі, праводзім прафарыентацыю ў школах горада. Пастаянна ўдасканальваюцца метады адаптацыі маладых работнікаў на вытворчасці. Выкарыстоўваецца інстытут настаўніцтва. Існуе сістэма навучання на вытворчасці. Нашы вытворчыя менеджары ў асноўным выраслі з нашых жа рабочых.

У 2015 годзе ў Гродне ўведзены ў строй новы вытворчы корпус, у якім умовы працы і вытворчасці створаны на ўзроўні самых сучасных сусветных стандартаў. У яго мы інвеставалі больш за 140 мільярдаў рублёў. У верасні 2015 года на прадпрыемстве створана прафсаюзная арганізацыя. Сёння яе членамі з'яўляюцца 2100 чалавек. У летні перыяд для дзяцей работнікаў прадпрыемства аплачвае 80% кошту пуцёвак у аздараўленчыя лагеры. У Гродне ведаюць, што «Контэ» актыўна займаецца дабрачыннасцю. Робім мы гэта з адкрытым сэрцам.

Ні ў мяне, ні ў маіх партнёраў і калег няма пачуцця заспакоенасці і адчування завершанасці пачатай справы. Мы настроены шмат працаваць і развівацца. Сёлета будзе дабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю трэці пускавы комплекс фабрыкі. Аб'ём інвестыцый — 10 мільярдаў рублёў. Уводзім сучасныя ачышчальныя збудаванні і на гэта інвеставалі 13 мільярдаў рублёў. Да канца 2017 года плануецца пабудаваць уласны ветрапарк для выпрацоўкі «зялёнай электраэнергіі», каб выкарыстоўваць яе на свае патрэбы. На гэта будзе выдаткавана каля 4 мільёнаў долараў.

Сферы дзейнасці метадычна пашыраем. Поўным ходам ідзе будаўніцтва найбуйнейшага ў Гродзенскай вобласці гандлёва-забаўляльнага комплексу агульнай плошчай больш як 80 тысяч квадратных метраў. Тут размесцяцца прадуктовы і будаўнічы гіпермаркеты, крамы, а таксама аб'екты па аказанні паслуг насельніцтву. Вялікую частку зоймуць зоны адпачынку: восем кіназал, дзіцячы гульнявы цэнтр і, вядома, рэстараны і кавярні. Увасходзіць у склад комплексу і лядовая арэна, на якой можна будзе праводзіць спартыўныя спаборніцтвы. Дасягнута дамоўленасць з адным з еўрапейскіх банкаў на атрыманне фінансавання гэтага аб'екта ў памеры 55 мільёнаў еўра. Думаю, пасля заканчэння будаўніцтва гродзенцы не захочуць ездзіць на шопінг у сумежныя Польшчу і Літву.

Не сакрэт, што на сучасным этапе асабліва жорсткая канкурэнтная барацьба ідзе ў сферы лёгкай прамысловасці. Гэты фактар неабходна ўлічваць, калі вядуцца перамовы і прымаюцца рашэнні аб стварэнні зон свабоднага гандлю з краінамі з таннай рабочай сілай. Канкураваць з пастаўшчыкамі, скажам, з В'етнамам, прадпрыемствам леграма будзе вельмі складана.

Я думаю, што для прадпрыемстваў-вытворцаў будзе важная і неабходная падтрымка дзяржавы. У першую чаргу — у выраўноўванні ўмоў канкурэнтнага асяроддзя ў частцы кошту пазыковага капіталу і кошту энергетычных рэсурсаў у параўнанні з умовамі ў сумежных краінах. На мой погляд, правільныя крокі ў гэтым кірунку зроблены. Мы разумеем, што гэтыя праблемы нельга зняць адразу, але паступова да іх вырашэння трэба падыходзіць.

Самая галоўная наша задача — перайсці сапраўды на інавацыйны шлях, укараняць найноўшыя тэхналогіі, выпускаць прадукцыю сучаснай якасці. Два дзесяцігоддзі кампанія імкнулася ўкараняць усё самае лепшае і прагрэсіўнае, і менавіта ў гэтым заключаецца сакрэт нашага поспеху. Прыемна ўсведамляць, што «Контэ Спа» стала ўжо адным з беларускіх брэндаў, як МАЗ і БелАЗ. Мы гэтым можам толькі ганарыцца.

■ З нагоды

# КАЛІ ГАВОРАЦЬ МУЗЫ

**Сімвалічным завяршэннем Года культуры можа стаць наданне Нацыянальнаму аэрапорту «Мінск» імя Францыска Скарыны**



**Пра гэта паведаміў міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ. Такая прапанова ўжо неаднойчы выказвалася дзеячамі культуры, ініцыятыву падтрымала і міністэрства. Барыс Святлоў расказаў, што адпаведныя звароты ўжо накіраваныя, і пытанне можа вырашыцца да канца года.**

Гаворка ідзе не толькі пра наданне імя Францыска Скарыны Нацыянальнаму аэрапорту, але і пра магчымасць надання іменаў славутых дзеячаў культуры, літаратуры самалётам, цягнікам.

Цягам Года культуры ўжо прайшло мноства знакавых для нашай краіны мерапрыемстваў. У іх ліку — святкаванне юбілейных дат: да 75-годдзя Уладзіміра Мулявіна тэатрам імя Максіма Горкага пастаўлены спектакль «Пясняр», ён быў прадстаўлены на гастролях па гарадах Беларусі і падчас фестывалю «Славянскі базар у Віцебску»; да 95-годдзя Івана Мележа на сцэне Купалаўскага паказалі спектакль «Людзі на балоце»; да 120-годдзя Кандрата Крапівы тэатр-студыя кінаакцёра паставіў спектакль па п'есе «Хто смяецца апошнім». Праходзяць вечарыны і выстаўкі да юбілея Максіма Багдановіча. Да 30-й гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у межах дабрачыннага творчага марафону «Адраджэнне» праведзены шэраг канцэртаў у раёнах Гомельскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей, якія пацярпелі ад аварыі. У фінальным канцэрце марафону, што прайшоў у Ельску, прыняў удзел і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Сёлета прынята рашэнне аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці 5 элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Гэта тэхналогія вырабу шчэпавай птушкі-абярэга на тэрыторыі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, традыцыі памінання продкаў на Ганцавіччыне, абрад гукання вясны «Чырачка» ў Тонежы Лельчыцкага раёна, неглюбская народная тэкстыльная традыцыя з Веткаўшчыны і абрад заклікання дажджу ў вёсцы Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна.

Адметна, што план мерапрыемстваў Года культуры закранае не толькі Беларусь, але і замежжа. Так, сёлета падпісаныя пагадненні аб супрацоўніцтве з міністэрствамі культуры Літвы і Латвіі, рыхтуюцца да падпісання падобныя пагадненні з Манголіяй, Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, В'етнамам, Катарам, Індыяй. Цяпер вядуцца актыўныя перамовы з міністрам культуры Расіі Уладзімірам Мядзінскім. Барыс Святлоў расказаў, што гаворка ідзе пра сумесную беларуска-расійскую вытворчасць фільмаў, магчымасць супольнай рэстаўрацыі аднаго з беларускіх замкаў. Важным праектам у межах міжнароднага культурнага супрацоўніцтва можа стаць і будаўніцтва шматфункцыянальнага комплексу на тэрыторыі сядзібы Ільі Рэпіна ў Здраўнёве, яго абмеркаванне вядзецца з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам.

Але Год культуры працягваецца, таму нас чакае яшчэ мноства яркіх імпрэз. Адзначым толькі некаторыя з іх. У верасні ў Магілёве пройдзе фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка», на які ўжо паступіла больш як 350 фільмаў з 45 краін, з 4 па 11 лістапада сталіца прыме Міжнародны кінафестываль «Лістапад», на снежань запланаваны І рэспубліканскі конкурс аматарскага кіно імя Юрыя Тарыча «Я здымаю кіно», ён адбудзецца ў Полацку.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■

# ДЗВЕ ВАЙНЫ — НА АДЗІН ЛЁС

**Сёння Герою Савецкага Саюза Васілю Мічурыну спаўняецца 100 гадоў**

**Ці думаў калі Васіль Сяргеевіч, што дажыве да такой прыгожай даты? Напэўна, не. Жыццё было вельмі няпростае, каб так далёка заглядваць наперад. Тым больш у яго лёсе — дзве вайны, дзе здавалася, што кожны дзень апошні...**

Зорку Героя Васіль Мічурын атрымаў яшчэ за савецка-фінскую вайну. Аб гэтай высокай узнагародзе даведаўся ад сваіх таварышаў. Вушам сваім не паверыў: героямі тады толькі лётчыкі станавіліся, а тут на табе — кулямётчыку пашанцавала!

Вось што расказаў мне Васіль Сяргеевіч пра тое, што ў свой час назвалі подзвігам: «А было ўсё так. Марозным лютаўскім днём 1940 года. Я быў тады кулямётчыкам 271-га мотастралковага палка 17-й мотастралковай дывізіі Паўночна-Заходняга фронту. Мы атрымалі загад аб наступленні. Падчас бою камандзір узвода быў смяротна паранены. Прыйшлося браць ініцыятыву ў свае рукі. 15 кулямётчыкаў да апошніх сіл змагаліся з ворагам. У жывых засталіся толькі я і падносчык патронаў Каралёў. Абарона праціўніка на рацэ Пінус-Ёкі, што каля вёскі Мэра (цяпер



Выбаргскі раён Санкт-Пецярбургскай вобласці), была паспяхова прарвана...» Так, лічы ў адзіночку, Васіль Мічурын даваў адпор ворагу.

Нягледзячы на такую высокую ўзнагароду, у Вялікую Айчынную ён быў звычайным салдатам. Прайшоў усю вайну: пачынаючы з абароны Мінска і заканчваючы штурмам Берліна. Але ўсё скончылася для яго толькі 13 мая 1945 года пад Прагай.

Пасля вайны Герой Савецкага Саюза служыў у Брэсце. Ужо тады для яго, рускага па нацыянальнасці, стала зразумела, што ён назаўжды звязаны з Беларуссю. Так і атрымалася. Хоць і служыў некаторы час у групе савецкіх войск у Германіі, шляхі-дарогі ўсё роўна вялі Васіля Мічурына ў Беларусь, якая стала для яго другой радзімай.

На працягу многіх гадоў Герой Савецкага Саюза (іх, дарэчы, у Беларусі разам з ім засталося ўсяго двое) з'яўляецца актыўным удзельнікам шматлікіх грамадскіх і ветэранскіх арганізацый. Нягледзячы на паважаны ўзрост, палкоўніка ў адстаўцы часта можна ўбачыць на розных мерапрыемствах. Асабліва даспадобы яму сустрэчы з моладдзю. Як гаворыць ветэран, колькі будзе жыць — столькі будзе сустракацца з моладдзю. Зычым Васілю Сяргеевічу, каб гэтых сустрэч у яго было яшчэ нямала!

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Весткі з Кітая

# ТРАСФЕР ПРАГРЭСУ

**Як ужо паведамляла «Звязда», у Пекіне праходзіць прадстаўнічы форум супрацоўніцтва СМІ «Адзін пояс, адзін шлях». На гэты раз у кітайскую сталіцу сабралася рэкордная колькасць удзельнікаў: прадстаўнікі 212 сродкаў масавай інфармацыі з больш чым сотні краін свету.**

Удзел у форуме бяруць дэлегацыі журналістаў з Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Грузіі, Украіны, Вялікабрытаніі, Італіі, Іспаніі, Бельгіі, Літвы, Латвіі, Францыі, Індыі, Аргенціны, ЗША, Новай Зеландыі, Аўстраліі, Егіпта, Эфіопіі, Інданезіі і шэрагу іншых. Як бачым, прадстаўлены абсалютна ўсе населеныя кантыненты свету.

Яно і зразумела, бо ініцыятыву ўвасаблення новага Шаўковага шляху нездарма называюць найбуйнейшым транснацыянальным праектам сучаснасці. Як заўважыў кіраўнік газеты «Жэньмінь жыбаа» (арганізатара маштабнага форуму, які, дарэчы, праходзіць трэці раз, пачынаючы з 2014 года) Ян Чжэньу, ініцыятыву «Адзін пояс, адзін шлях» падтрымалі ўжо 70 краін, дзе пражывае 2/3 насельніцтва планеты. Цягам трох гадоў рэалізацыі праекта былі створаны 60 тысяч працоўных месцаў, а агульны аб'ём інвестыцый ацэньваецца ў 20 трыльёнаў долараў. Гэта насамрэч трансфер перадавых тэхналогій і распрацовак, што аб'ядноўвае людзей у імкненні да пабудовы эканамічна заможнай і бяспечнай будучыні, наладжванні трывалых гуманітарных і культурных мастоў паміж краінамі і народамі. Як вядома, Беларусь на Шаўковым шляху займае адно з ключавых месцаў.

Паводле слоў намесніка генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Ву Хонбо, зараз распрацавана Канцэпцыя ўстойлівага развіцця да 2030 года. Глабальная праграма змяшчае 17 мэт і акрэслівае шлях далейшага развіцця сусветнай супольнасці. Адна з галоўных задач — пераадолець беднасць і голад. Як заўважыў Ву Хонбо, ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях», што ахоплівае Еўропу, Азію і Афрыку, адыграе значную ролю ў рэалізацыі Канцэпцыі ўстойлівага развіцця.

«Кітай прапануе ўсім краінам эфектыўнае, узаемавыгаднае і рознапланавае супрацоўніцтва, — адзначаецца ў вітанні старшыні КНР Сі Цзіньпіня ўдзельнікам форуму. — Новы Шаўковы шлях з'яўляецца дасягненнем усіх дзяржаў свету. А сродкі масавай інфармацыі адыгрываюць у развіцці праекта значную ролю. Пры гэтым форум служыць платформай для дыялогу і практычнага ўзаемадзеяння».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** *litvinov@zviazda.by*

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У ТОПЕ — ПРАГРАМІСТЫ І СТРАХОЎШЧЫКІ

Заробак у 2000 рублёў і больш атрымліваюць 1,6 працэнта беларусаў

**Белстат падлічыў прыбыткі работнікаў. Менш за 200 рублёў (2 мільёны да дэнамінацыі) атрымлівае 2,3 працэнта супрацоўнікаў абследаваных арганізацый. Заробак да 400 рублёў мае амаль кожны трэці (29 працэнтаў). 14,5 працэнта работнікам плацяць у месяц ад 400 да 500 рублёў, 20 працэнтам — ад 600 да 800 рублёў.**

Прыбыткам у 800—1000 рублёў забяспечаны кожны дзясяты беларус. Ад 1000 да 1500 атрымліваюць 8,8 працэнта работнікаў. Яшчэ 1,9 працэнта спецыялістаў маюць па 1500-2000 рублёў у месяц. У параўнанні з мінулым годам, супрацоўнікаў з заробкам у 1000 (10 мільёнаў) і вышэй стала на два працэнты больш.

Сярэднемесячная налічаная заработная плата за чэрвень склала 738 рублёў. Гэта на 20 рублёў больш, чым у маі. Праўда, рэальны прыбытак у параўнанні з чэрвенем мінулага года ўпаў на 4,5 працэнта.

У лідарах па заробках традыцыйна Мінск. Сталічныя работнікі атрымліваюць у сярэднім па 1045 рублёў. Пры гэтым у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях месячны прыбытак складае каля 630 рублёў.

Што да спецыялістаў, то самымі вялікімі заробкамі могуць пахваліцца айцішнікі. У сярэднім беларускі праграміст атрымлівае 3760 рублёў (37,6 мільёна недэнамінаваных). У топе высокааплатных прафесій таксама работнікі паветранага транспарту (у месяц маюць ад 1400 да 1970 рублёў), прамыслоўцы, занятыя вытворчасцю хімічных прадуктаў (1250 рублёў), спецыялісты, звязаныя з фінансавай і страхавой дзейнасцю (1200—1700 рублёў).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## КАБ ПРАЦАВАЛІ З НАСТРОЕМ

**Першы маладзёжны экіпаж камбайнераў-тысячнікаў на Гомельшчыне ўшанавалі 27 ліпеня непасрэдна на полі. Камбайнерам Аляксандру Кашыцкаму і Дзмітрыю Вараб'ёву, якія працуюць у філіяле «Савецкая Беларусь» Рэчыцкага камбіната хлебапрадуктаў дыпломы і падарункі ўручыў першы сакратар Гомельскага абласнога камітэта БРСМ Ігар ЗАВАЛЕЙ.**

Маладыя механізатары намалацілі больш за адну тысячу тон збожжа. Як расказалі ў прэс-службе абласнога камітэта БРСМ, хлебаробы працуюць на айчынным камбайне КЗС-1218. З пачатку жніва яны ўбралі больш як 250 га збожжа. У гэты дзень шанавалі і двух дзяўчын: Наталлю Бракарэнку і Ірыну Склімянок. Яны ўваходзяць у склад экіпажаў гаспадаркі «Абарона краіны» Рэчыцкага раёна. Падарунак ад БРСМ атрымаў і Аляксандр Сыс — малады кіроўца гэтай гаспадаркі, які з пачатку жніва перавёз звыш 1 тысячы тон збожжа.

Дарэчы, падобныя акцыі па ўшанаванні маладых аграрыяў, якія цяпер убіраюць хлеб, пройдуць ва ўсіх раёнах Гомельшчыны. Агульны намалот збожжа ў вобласці на сённяшні дзень дасягнуў 427 тыс. т. Сярэдняя ўраджайнасць вышэйшая за леташнюю на 20% і складае 30 ц з гектара.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ШКОЛЬНЫЯ ТАВАРЫ — НА ДОМ

У вёскі, дзе няма крам, форму і канцтавары прывязуць пад заказ

**Да новага навучальнага года ў Беларусі пройдзе тысяча выставак-продажаў і 470 школьных базараў. А ў сельскай мясцовасці будзе працаваць 4,4 тысячы кутко́ў школьніка. Пра гэта паведаміў начальнік аддзела нехарчовых тавараў упраўлення гандлю Белспажыўсаюза Віталій ШКЕЛКО.**

Пакупнікам прапануюць больш за 50 тысяч адзінак адзення для вучняў, 60 тысяч адзінак трыкатажных вырабаў, 50 тысяч пар скуранога абутку. 97 працэнтаў тавараў, якія рэалізуе Белспажыўсаюз, — айчыннай вытворчасці.

У цэлым спецыялізаваны асартымент можна набыць у шасці тысячах гандлёвых аб'ектаў спажыўкааперацыі ў райцэнтрах і вёсках. У населеных пунктах без крам гатовы прымаць заяўкі на школьныя тавары і забяспечыць іх дастаўку.

Па падліках Белспажыўсаюза, сабраць сёлета вучня малодшых класаў на заняткі бацькам будзе каштаваць ад 180 да 600 рублёў. Гэта прыкладныя затраты на адзенне, абутак і школьныя рэчы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## МОЛАДЗЬ НА СТЫКУ ТРОХ КРАІН

**XXV Міжнародны маладзёжны лагер «Бе-La-Русь» распачынае сёння сваю работу ў Верхнядзвінскім раёне.**

— Лагер штогод арганізуецца на стыку межаў трох краін — у раёне Кургана Дружбы. Арганізатары, як і раней: Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Саюз за прагрэс моладзі Латвіі, Расійскі Саюз Моладзі. На вяршыні кургана расце дуб — як сімвал добрасуседскіх адносін трох нацый. Менавіта таму дубовы ліст — сімвал лагера, — паведамілі «Звяздзе» ў Віцебскім абласным камітэце БРСМ.

Каля 500 хлопцаў і дзяўчат возьмуць удзел у дзясятках мерапрыемстваў. З улікам юбілейнага характару сёлетняга міжнароднага лагера ў праграме з'явіліся навінкі: упершыню адбудзецца спартыўны фестываль «Бе-La-Рускія алімпійскія гульні». Гэта — комплекс камандных і індывідуальных спаборніцтваў: футбол, валейбол, канат, армрэслінг, гіравы спорт.

Не менш насычаная сёлета і культурная праграма: фестывалі «Бе-La-Рускія зоры» і бардаўскай песні, конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Каралева «Бе-La-Русі», бітва дыджэяў «Залатыя хіты XX стагоддзя» і іншае.

Для пачаткоўцаў лагера будуць працаваць творчыя майстэрні.

Традыцыяй сталі выступленні «зорак». На галоўнай сцэне выступяць удзельнікі «залатога складу» легендарнага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры».

Закрыецца лагер у нядзелю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# Адчыніце, да вас капрамонт!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Прасіць рабочых зрабіць нешта за наяўныя грошы дарэмна — майстры выканаюць неабходныя паслугі, толькі калі жыхар падасць у ЖЭС адпаведную заяўку і аплаціць заказ, — патлумачыла **Лілія ЕРМАЛАЕВА, галоўны інжынер ЖЭУ № 4 Заводскага раёна г. Мінска.** — Скардзіцца нам, што спецыяліст адмовіўся збіваць плітку ці настойвае на тым, што трэба ліквідаваць зашытую наглуха нішу, за якой схаваны магістральны трубапровад, таксама не трэба. Ён мае права адмовіцца рабіць тое, што не прадугледжана праектам. А дабрацца да камунікацый мы павінны, бо іх абавязкова трэба замяніць пры капрамонце.



Згодна з артыкулам 97 Жыллёвага кодэкса Беларусі, усё, што знаходзіцца ў кватэры, — уласнасць жыльца, і работы там выконваюцца за яго кошт. Бясплатна пры капрамонце абавязкова заменяць толькі магістральныя трубы: стаякі халоднай і гарачай вады, каналізацыйны. Дарэчы, гаспадар не можа купіць трубы, якія яму падабаюцца, — усё роўна паставяць тыя, што прадугледжаны праектам.

— Самадзейнасць тут не дапускаецца. Матэрыял, з якога цяпер робяць трубы, імпартны, сучасны і якасны, і не трэба мудрагеліць занадта, набываючы самае-самае, — папярэдзіла Лілія Барысаўна. — Тое ж самае тычыцца замены ацяпляльных прыбораў. Трэба атрымаць дакумент, дзе будзе пазначана тэхнічная магутнасць батарэі. На яго падставе зробяць праект, што дазволіць пераўладкаваць ацяпляльны прыбор. Батарэя можа быць любой сістэмы і фірмы, аднак калі праектам прадугледжана 4 рабрыны, то 8 вы не паставіце. Інакш у доме сапсуецца цыркуляцыя цепланосьбітаў (вады), ды і цяплей у два разы ўсё роўна не будзе.

У доме з газавымі плітамі, дарэчы, мяняюцца таксама і газавыя трубы (за кошт дзяржавы). Пры гэтым трэба памятаць: калі абсталяванню больш за 10 гадоў, пасля замены камунікацый назад пліту не падключаць, пакуль не набудзеце новую.

Пасля работ майстры ЖЭС заўжды прыбіраюць за сабой і выносяць смецце. Адзінае выключэнне — плітка. Яе нельга проста выкінуць на сметнік, без папярэдняй апрацоўкі. Таму прыйдзецца заплаціць за яе вываз дадаткова. Старыя вокны з кватэры на сметнік таксама павінны выносіць тыя, хто іх мяняе (як правіла). Пры гэтым адтуль папярэдне трэба дастаць шыбы.

## ПАД'ЕЗД РАМАНТУЕ ЖЭС, А ФАРБУЮЦЬ — ЖЫХАРЫ

У самім доме пры капітальным рамонце парадкуюць дахі, мяняюць вокны ў месцах агульнага карыстання (пад'ездах), дзверы ў тэхнічныя памяшканні: электрашчытавыя, падвалы, цеплавузлы, выхады на дах, машынныя памяшканні. Усталёўваюць маланкаадводы на даху. Рамантуюць фасад будынка і стыкі паміж плітамі. Чысцяць вентыляцыйныя каналы, мяняюць лівеневую каналізацыю, калі яна ўбудаваная ў дом.

Цеплавая рэабілітацыя, да якой прывыклі ўласнікі, на фасадах цяпер не робіцца, калі для гэтага няма прычын па выніках цеплавізійнага абследавання.

— Колькі разоў мы праводзілі праверкі, прамярзанні пацвярджаюцца рэдка і кропкава ў некаторых кватэрах. Такога, каб увесь дом меў патрэбу ва ўцяпленні, амаль не здараецца. Аднак памяшканні, дзе панэлі сапраўды кепска сябе паводзяць і стыкі прамярзаюць, мы за кошт ЖЭС уцяпляем падчас капрамонту, — расказала галоўны інжынер. — Калі тэрмін яго не надышоў, то рэабілітацыя робіцца ў межах бягучага рамонту (як правіла, праз год і таксама за дзяржаўныя сродкі). За свой кошт уцяпліцца можна хутчэй.

Электраправодку ў пад'ездзе бясплатна мяняюць толькі да першай размеркавальнай каробкі, што знаходзіцца каля дзвярэй кватэры. Канцы правадоў заводзяць у памяшканне і злучаюць са старымі кватэрнымі. Унутры замена правадоў, укладванне іх у карабы, штрабленне сцен і перанос разетак — за кошт жыльцоў і з абавязковым праектам (асабліва калі патрэбна павялічыць колькасць разетак). Звярнуцца па гэтую паслугу можна і да ЖЭС, і да падрадчыка, які працуе падчас капрамонту.

> **«Прасіць рабочых зрабіць нешта за наяўныя грошы дарэмна — майстры выканаюць неабходныя паслугі, толькі калі жыхар падасць у ЖЭС адпаведную заяўку».**

Перыядычна ў пад'ездзе за кошт жыхароў павінен адбывацца касметычны рамонт: атынкоўка і афарбоўка сцен і столі.

— Мы абходзім пад'езды і складаем дэфектныя акты, дзе вызначаем працэнт пашкоджанняў. Па выніках прымаем рашэнне — рабіць поўны касметычны рамонт ці частковы. У асноўным церпіць уваходная група — некалькі першых паверхаў: іх прыходзіцца аднаўляць кожны раз. А вышэй ужо нармальна, — адзначыла Лілія Ермалаева. — Папярэдне мы сустракаемся з жыхарамі і абмяркоўваем, на колькі месяцаў рабіць растэрміноўку аплаты работ, і заказваем колер і якасць фарбы, зыходзячы з іх пажаданняў. Некаторыя нават плітку дадаткова аплачваюць, каб прыгажэй было.

**Капітальны рамонт дома могуць выконваць як рабочыя ЖЭС, так і падрадныя арганізацыі, з якімі ў людзей часта ўзнікаюць непаразуменні. Перад пачаткам работ прадстаўнік падрадчыка, як і ЖЭС, паведамляе жыхарам на агульным сходзе, што будзе адбывацца, а раз на тыдзень прымае грамадзян па асабістых пытаннях.**

**Каб вырашыць спрэчныя моманты і разабрацца, хто і што каму павінен, лепш тэлефанаваць у службу тэхнічнага назірання, якая замацавана за кожным домам падчас правядзення ўсіх работ. Штотыднёва яна разглядае ўсе пытанні, што ўзнікаюць, пакуль ідзе капрамонт, а на самім доме вісіць пашпарт аб'екта з нумарамі, прозвішчамі і пасадамі тых, да каго трэба звяртацца з пытаннямі.**

## МАГЧЫМАСЦІ БЯСПЛАТНЫЯ, ПА ГРАФІКУ І ПА ДАЗВОЛЕ

За некаторыя паслугі па добраўпарадкаванні жылля ўласнікам плаціць не трэба. У абавязак эксплуатацыйнай службы ўваходзіць, напрыклад, чыстка казырка над пад'ездам. Аднак яна праводзіцца па графіку, і калі жыхар папросіць вымесці адтуль недакуркі, а ЖЭС там пару тыдняў як прыбраў, — за гэта прыйдзецца заплаціць або чакаць наступнага разу па графіку.

> **Калі абсталяванню больш за 10 гадоў, пасля замены камунікацый назад пліту не падключаць, пакуль не набудзеце новую.**

Замена лямпачак таксама бясплатная. Гэтая паслуга ўваходзіць у паняцце «тэхнічнае абслугоўванне». Аднак калі супрацоўнікі ЖЭС самі не бачаць, што яна перагарэла, жыльцам трэба званіць на адзіны нумар 115, каб заказаць паслугу па замене лямпачкі.

За кошт дзяржавы падчас бягучага рамонту мяняюць таксама свяцільнікі, усталёўваюць датчыкі АСК (яны запальваюць святло, рэагуючы на гук ці рух) або сэнсарныя кнопкі, што рэагуюць на дотык далоні. Рамантуючы электрашчыткі, мяняючы ў іх звычайныя кватэрныя аўтаматы (пераключальнікі, што абясточваюць кватэру). Пры гэтым асабістыя пераключальнікі жыльца (напрыклад, для пральнай ці пасудамыйнай машыны) новыя не ставяць.

— Апорныя сцены жыхарам ніколі не забаранялася «пераносіць» — гэта міф. Проста гэта рэдка хто робіць. Часцей за ўсё ў іх праразаюць аркі ці іншыя праёмы. Гэта дазваляецца, калі рабіць адпаведны праект і наймаць падрадчыкам спецыялізаваныя арганізацыі, — расказала супрацоўніца ЖЭС. — Пасля ўсе змены трэба ўзаконіць афіцыйна. Напрыклад, часта пакой аб'ядноўваюць з лоджыяй. Калі гэта робіцца без папярэдняга дазволу, жылец атрымае штраф. Але калі ён узаконіць змяненне, пакуль ідзе адміністрацыйны працэс, усё будзе ў парадку нават пастфактум.

Спецыяльны дазвол трэба набываць і каб зрабіць сабе падлогу з падагрэвам электрычнасцю. Абаграваць падлогу вадой хутчэй за ўсё забароняць — інакш праз гэта будзе пакутаваць увесь пад'езд. Перад падключэннем бойлера, пасудамыйкі ці замены газавай пліты электрычнай таксама лепш зрабіць праект, у якім спецыялісты адразу падлічаць, ці не перанапружыцца сістэма ад работы такога энергапатрабавальнага абсталявання.

Праектна-каштарысная дакументацыя і дазвол спатрэбяцца і тым, хто намерыцца зрабіць пад балконам падвал або прыбудаваць сам балкон, якога на першых паверхах у старых дамах часта няма.

— Каб не трапіць у няёмкае становішча, лепш выклікаць нашага спецыяліста і сказаць, што вы плануеце рабіць у кватэры. Ён пракансультуе, ці можна гэта зрабіць, параіць, што набыць, і нават каштарыс можа скласці, — дадала Лілія Барысаўна. — Яго кошт абыдзецца ў 2% ад каштарыснай вартасці або бясплатна, калі рабіць усё будуць работнікі ЖЭС. Прымушаць заказваць запланаваныя работы толькі ў нас ніхто не будзе.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

## НЯВЫРАШАНЫХ ПРАБЛЕМ НЕ БЫВАЕ

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу

Практыка падобных зносін паміж жыхарамі краіны і мясцовымі ўладамі працягваецца ўжо больш за год. Кожную суботу ахвотныя могуць задаць пытанні і агучыць надзённыя праблемы чыноўнікам па сродках тэлефоннай сувязі. Такі спосаб узаемадзеяння створаны з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

**У гэтую суботу, 30 ліпеня, прамыя тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
кіраўнік спраў НАРКЕВІЧ Юрый Іосіфавіч (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алёйзавіч (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

■ Факт

## АЛКАГОЛЬ — У СПЕЦАДДЗЕЛЫ

«Пара вырашыць пытанне аб абмежаванні часу рэалізацыі алкагольнай прадукцыі, — заявіў учора **начальнік упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Алег КАРАЗЕЙ.** — Злачынствы ўчыняюцца ў больш позні час. Людзям не хапае спіртнога, і яны ідуць у начны магазін, а потым іх цягне на прыгоды. Зніжэнню колькасці злачынстваў садзейнічала б абмежаванне гандлю алкаголем з 22.00 да 9.00. Было б правільна вырашыць пытанне аб рэалізацыі алкагольнай прадукцыі ў спецыялізаваных магазінах або хаця б спецыяльных аддзелах, каб спіртныя напіткі не стаялі ў адным радзе з таварамі першай неабходнасці».

**БЕЛТА.**

## «ЗОЛАТА» — СА ШВЕЙЦАРЫІ, «СЕРАБРО» — З ГАНКОНГА

**Гродзенец Эрык КАМЛЫК і шчучынец Андрэй АСАНАЎ заслужылі права без конкурсу паступіць у ВНУ нашай краіны.**

Выпускнік Гродзенскай гарадской гімназіі Эрык Камлык выдатна праявіў сябе на 47-й міжнароднай фізічнай алімпіядзе ў Цюрыху (Швейцарыя). Ён стаў найлепшым сярод больш як 450 юных фізікаў амаль са 100 краін. А выпускнік Шчучынскай гімназіі Андрэй Асанаў пасля леташняга пахвальнага водгуку на міжнароднай матэматычнай алімпіядзе ў Тайландзе заваяваў «серабро» ў Ганконгу, дзе спаборнічалі больш за 650 удзельнікаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## «РАКА ЖЫЦЦЯ» З'ЯВІЦЦА Ў ПАСЁЛКУ ЛЯСНЫ

**У хуткім часе цэнтр аграгарадка Лясны ўпрыгожыць скульптура з сімвалічнай назвай «Рака жыцця». Яна ўяўляе сабой замкнутую лінію, што нагадвае стужку Мёбіуса.**

Яе аўтары — архітэктар Іван Арцімовіч і скульптар Аляксандр Сакалоў. Стваральнікі ўлічвалі сусветныя тэндэнцыі ў малой архітэктуры. Кампазіцыя сімвалізуе замкнуты рачны паток і з розных ракурсаў глядзіцца па-іншаму. Гэта, па іх словах, жыццё, арыентаванае на вечнасць.

У абмеркаванні праекта ўдзельнічалі і мясцовыя жыхары. Разам з аўтарамі, старшынёй Бараўлянскага сельскага Савета Жаннай Варабей, прадстаўнікамі ўлады яны вырашалі, як лепш добраўпарадкаваць плошчу, дзе будзе ўстаноўлена кампазіцыя.

Дадам, што літаральна за год пасёлак Лясны і вёска Бараўляны непазнавальна змяніліся. Прыведзены ў парадак дваровыя тэрыторыі, добраўпарадкаваны месцы адпачынку, прыпынкі грамадскага транспарту, заасфальтаваны вуліцы і выкладзены пліткай тратуары, усталяваны святлафоры, з'явіліся новыя сметніцы і лаўкі, аўтамабільныя паркоўкі. Вядзецца таксама праектаванне і будаўніцтва дзіцячых садкоў і школ. Гэта стала магчымым дзякуючы абласной праграме развіцця малых гарадоў. Толькі летась на ўладкаванне двух населеных пунктаў затрачана больш як 600 млрд рублёў. «Нам стала жыць зручней і камфортней», — казалі жыхары і дзякавалі кіраўніцтву Мінаблвыканкама, які ініцыяваў змены. А гэтая кампазіцыя яшчэ больш аб'яднае іх у адным жаданні — зрабіць пасёлак больш прыгожым і ўтульным.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*



# Жывём наадварот

Каля нашага пад'езда заўсёды шмат бяздомных катоў. Раней іх падкормлівала невысокая бабулька з добрым тварам. Пасля таго, як яе не стала, іх працягвае карміць яе сын. У памяць пра маці.

Гарачыя спрэчкі і шквал асуджэння ў сацыяльных сетках выклікаў эксперымент Дзіцячага фонду ААН у Грузіі. На відэароліку працягласцю амаль дзве хвіліны шасцігадовая дзяўчынка Анана выходзіць на вуліцу адна — спачатку чысценькай, прыгожа апранутай. Мінакі распытваюць яе пра тое, колькі ёй гадоў, як яе завуць, і ці не згубілася яна. Затым Анане на твар наносяць макіяж, які ставарае ўражанне бруду, і максімальна набліжаюць яе вобраз да «беспрытульніцы». Рэакцыя мінакоў радыкальна мяняецца. На маленькую дзяўчынку, якая самотна стаіць пасярод вуліцы, ужо ніхто не звяртае ўвагі. Аналагічная рэакцыя была на з'яўленне дзіцяці і ў рэстаране. Ад Ананы ў брудней вопратцы людзі адварочваліся. Хтосьці хаваў далей ад яе сумку, адзін з мужчын папрасіў афіцыянта выправадзіць малую на вуліцу. «Сумна, але не магу сказаць упэўнена, што паводзіла б сябе ў такой сітуацыі інакш», — шчыра прызналася мая прыяцелька, маці дваіх дзетак.

На днях у метро зусім выпадкова сустрэла знаёмую дзяцінства. З Алесяй, памятаю, яшчэ ў школе ніхто не хацеў сябраваць, бо яна была непапраўнай эгаісткай і «шасцёркай». Слова за слова — разгаварыліся. «Ніхто мяне не любіць, ніхто мной не цікавіцца...», — паскардзілася дзяўчына. І ў гэтым па-ранейшаму вінаватыя ўсе (адзін не так паглядзеў, другі не так сказаў), акрамя яе. Але ж успомнім усходнюю мудрасць: «Сябра без недахопаў не бывае. Пачні шукаць хібы і застанешся без сябра».

«Паглядзіце, колькі вакол добрых людзей, чыстых, незвычайных, цікавых твараў, — заклікае акцёр Пётр Мамонаў. — Калі мы бачым гадасць — значыць, яна ў нас. Падобнае прыцягваецца да падобнага. Калі я гавару: вось пайшоў зладзюга — значыць, я сам спёр калі не тысячу долараў, то цвік. Не асуджайце людзей, зірніце на сябе.

Выратуй сябе і хопіць з цябе. Палюбі сябе, а потым самалюбства ператвары ў любоў да бліжняга — вось норма. Мы ўсе замест таго, каб быць шчодрымі — скнарнічаем. Жывём наадварот, на галаве ходзім. На ногі ўстаць — гэта аддаць. Але калі ты аддаў дзесяць тысяч долараў, а пасля пашкадаваў, падумаў, што трэба было аддаць пяць, — тваёй добрай справы, лічы, і няма».

Сумна, але часам адносіны сапраўды нагадваюць гандаль: ты мне — я табе. Мы рупімся, каб, не дай бог, не аддаць больш, чым атрымалі. Скупімся на добрыя словы. Павярхоўна, па вопратцы, ацэньваем людзей. І забываемся на тое, што толькі безумоўная любоў здзяйсняе цуды. І што жыццё занадта кароткае для чагосьці меншага.

...Аднойчы Томас Эдысан вярнуўся дадому са школы і перадаў маме ліст ад настаўніка. Мама зачытала сыну пісьмо ўголас, са слязамі на вачах: «...Ваш сын — геній. Гэтая школа занадта малая, і тут няма настаўнікаў, здольных яго чамусьці навучыць. Калі ласка, вучыце яго самі».

Праз шмат гадоў пасля смерці маці (Эдысан да таго часу ўжо быў адным з найвялікшых вынаходнікаў стагоддзя) вучоны пераглядаў старыя сямейныя архівы і наткнуўся на гэты ліст. Ён адкрыў яго і прачытаў: «...Ваш сын — разумова адсталы. Мы не можам больш вучыць яго ў школе разам з усімі. Таму рэкамендуем вам вучыць яго самастойна дома».

Эдысан праплакаў некалькі гадзін. Потым запісаў у свой дзённік: «Томас Алва Эдысан быў разумова адсталым дзіцем. Дзякуючы сваёй гераічнай маці ён стаў адным з найвялікшых геніяў свайго стагоддзя».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *dryla@zviazda.by*

**Сямейная газета**

Выпуск № 14 (57)

■ Нататкі таткі

# РАСЦІ, БАРАДА, РАСЦІ!

**Што знешне аб'ядноўвае Сакрата, Карла Маркса і Льва Талстога з мужчынамі-сучаснікамі? Ніколі не памыліцеся, калі скажаце — барада. Расліннасць на твары зноў у модзе. І апынуцца ў вагоне метро паміж барадачамі гэтак жа лёгка, як і сустрэць на вуліцы дзіця з марозівам. У сваю чаргу карэспандэнт «Звязды» склаў барадаты даведнік, у якім знайшлося месца жартам, дзецям, цырульнікам і нават касметыцы, якая дапамагае хутчэй адгадаваць бараду.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Трэці ўзрост

# «ЗАХАЦЕЛАСЯ СТАЦЬ БОЛЬШ НЕЗАЛЕЖНАЙ»

## Наша гераіня — пра тое, што вучыцца новаму ніколі не позна



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Якая яна, сучасная 60-гадовая беларуска? Чым жыве, пра што марыць? Калі вы думаеце, што ўсе яе інтарэсы абмяжоўваюцца градкамі ды ўнукамі, то вельмі памыляецеся. Ёсць, зразумела, і такія, магчыма, іх нават нямала. Але яны ўжо не ў большасці. Знаёмцеся, сённяшняя гераіня нашай рубрыкі — 61-гадовая Святлана Багданоўская, працуе доктарам у 33-й студэнцкай паліклініцы сталіцы.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

■ Выпрабавана на сабе

# У АДПАЧЫНАК? З ДЗІЦЕМ!

**— Мы з Ромам, калі яму было тры месяцы, ездзілі «дзікунамі» на мора, — аднойчы пачула я аповед знаёмай мамы. — Жылі ў палатках. Было так весела!» — Неверагодна, — падумала я. — Адпачынак у такіх умовах магчымы хіба што з дзецьмі з разраду «паеў-сплю».**


Адпачынак з сябрам – удвая весялейшы.

Калі нарадзіўся Даня, мы адразу адчулі: паездкам і выхадам «у свет» прыйшоў канец. І справа нават не ў тым, што нам няма з кім пакінуць на пэўны час дзіця (ёсць бабуля і дзядуля), але сын быў такі неспакойны, што прыводзіў усіх нашых «нянек» у стан паніні.

Браць з сабой — таксама не выхад, бо нават у магазін па прадукты было цяжка забегчы, дзіця імгненна прачыналася і пачынала галасіць, а супакоіць — паспрабуй яшчэ! Пра тое, каб паехаць у цэнтральны ўнівермаг я нават не марыла. Мы з мужам, вядома, чакалі пэўны час і зноў рабілі спробу як-небудзь разнастаіць жыццё, але ўсё заканчвалася аднолькава: мерапрыемства зрывалася, а мы стрымгалоў ляцелі дадому, бо малое заходзілася ад плачу.

Калі наш крыкун падрос, то ператварыўся ў такога гарэзу, што інакш як бягом не перасоўваўся. А за ім і мы з мужам. Спартыўная сямейка! Жарты жартамі, але з такім непаседам не адпачнеш, хутчэй больш стомішся.

За першыя тры гады жыцця Дані мы ездзілі з ім хіба што ў вёску да бабулі. Але ў новых умовах і без таго неспакойнае дзіця пачынала паводзіць сябе яшчэ больш трывожна: адмаўлялася ад ежы, горш спала, а пасля вяртання дадому амаль кожны раз пачынала хварэць. Натуральна, задавальнення ад такіх паездак становілася ўсё менш.

З цягам часу Даня, як мы ні спадзяваліся, не стаў менш гарэзлівым, шумным, аднак мы навучыліся з ім спраўляцца і сёлета (сыну ўжо 4!) нават адважыліся на сумесны адпачынак. Але справа ў тым, што малы не любіць доўгі час знаходзіцца на адным месцы і павінен асвойваць тэрыторыю, прычым можа, не баючыся, згубіцца, адысці на вялікую адлегласць. Таму мы адразу вырашылі: бавіць час пад пякучым сонцам на пляжы ў натоўпе адпачывальнікаў — не для нас. І паехалі ў санаторый, тым больш і здароў'е можна папраўляць.

Выбралі нешматлюдную здраўніцу, з хваёвым лесам, прыгожым возерам і шырокім комплексам лячэбных паслуг.

Сын, натуральна, ператварацца ў ціхоню не збіраўся, і нам спатрэбіліся немалыя намаганні (і, шчыра кажучы, нервы), каб давесці да малога, што нельга бегаць па сталовай, а падчас лячэбных працэдур парушаць цішыню. За першыя два дні Даню ўжо ведалі і адпачывальнікі, і работнікі санаторыя.

Збіраючыся ў дом адпачынку, мы асабліва не спадзяваліся на вялікую разнастайнасць забаў. І дарэмна. Спартыўныя спаборніцтвы, экскурсіі, кінафільмы і клуб-караоке. Наш звычайна такі нецярплівы малы з задавальненнем удзельнічаў усюды.

У вольны час мы гулялі па лесе, збіралі шышкі, разглядалі расліны, шукалі грыбы. Даня ўяўляў сябе сапраўдным падарожнікам і нават не заўважыў, як прайшоў каля трох кіламетраў.

А паездка на роварах стала сапраўднай прыгодай. Па дарозе нас напаткаў дождж, і мы схаваліся ад яго пад невялічкім дрэвам, дзе знайшлі шмат вялізных слімакоў. Даня пішчаў ад захаплення. І мы з мужам следам. Бо гледзячы, як сын радуецца такім, здаецца, звычайным рэчам, і мы крыху адчулі сябе маленькімі.


Вандроўка па лесе – сапраўдная прыгода!

Да таго ж Даня хутка знайшоў сабе кампанію для гульні — дзяўчынку-аднагодку, а праз дзяцей пасябравалі і бацькі. І паколькі малыя добра бавілі час разам, то і дарослым атрымалася адпачыць: і на пляжы, і на спартыўнай пляцоўцы, і на шашлыках, і нават на дыскатэку схадзісь (дзеці ў гэты час з захапленнем малявалі побач на крэслах).

Ад'язджалі мы з санаторыя з прыемным адчуваннем, што адпачынак атрымаўся. І намерам адпачываць толькі ўсёй сям'ёй разам.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ,**
**Фота аўтара**

■

## У бацькоўскі нататнік

Адпачынак з дзецьмі патрабуе больш дакладнай падрыхтоўкі. Трэба паклапаціцца пра шматлікія дробязі, каб не сапсаваць сабе падарожжа.

### Што ўзяць з сабою

**Адзенне:** і на спякотнае надвор'е, і на халоднае. Бялізну. Шкарпэткі. Купальнік або плаўкі. Некалькі галаўных убораў.

**Абутак:** сандалі, красоўкі, гумавыя боцікі, сланцы (калі ваша дзіця ўжо можа іх насіць).

**Аптэчку.** Лекі ад алергіі, ад прастуды, ад сінякоў і расцяжэнняў, ад укалыхвання ў транспарце, пры страўнікава-кішачных расстройствах, пры прарэзванні зубоў, антысептык. Акрамя таго, вазьміце з сабою тэрмометр, сродкі ад камароў і кляшчоў, ад сонечных апёкаў, піпеткі, вільготныя сурвэткі, ватныя палачкі, бінт, вату, грушу для адсмоктвання слізі з носа, пластыр.

**Сродкі гігіены:** дзіцячае мыла, шампунь, мачалку, зубную пасту і шчотку, крэм.

**Цацкі** (і для гульні на вуліцы ў тым ліку), альбомы для малявання, размалёўкі, алоўкі, дзіцячыя кніжкі. Каму больш даспадобы планшэт або плэер, то іх.

**Дзіцячую сумачку або заплечнік.** Так уласныя рэчы малы зможа насіць сам.

**Акуляры ад сонца, нарукаўнікі або надзіманы круг, бутэльку для вады.**

**Дзіцячы гаршчок.** Лічыцца, што да пяці гадоў дзіця не павінна карыстацца грамадскім туалетам. Да таго ж гаршчок можа спатрэбіцца і ў дарозе, калі вы едзеце, напрыклад, на цягніку.

Для немаўлят спатрэбяцца пялёнкі, падгузкі, каляска, дзіцячае харчаванне.

### Дарога

Многія дзеці дрэнна пераносяць дарогу, таму плануйце паездку на гадзіны, калі малы будзе спаць. Абавязкова вазьміце з сабою цацкі, якія дапамогуць дзіцяці цікава бавіць час. Сумняваецеся, на машыне ці цягніку? Лепш на апошнім, дзецям там больш цікава і не прыйдзецца дойгі час сядзець у дзіцячым аўтакрэсле.

### У санаторый

Выбірайце не вельмі шматлюдны пансіянат, пажадана ў вёсцы, далей ад магістралі; з шырокай інфраструктурай для забаў, сучаснымі дзіцячымі пляцоўкамі і дзіцячым гульнявым пакоем. Калі ні аднаго, ні другога няма, прыйдзецца ўключыць фантазію і выдумляць забавы самастойна. Паверце, гэта не надта цяжка. Нават у звычайным пешым шпацыры можна зведаць шмат цікавага, калі нешта сабе ўявіць, а ў дзяцей, вядома, з фантазіяй усё добра.

### На мора

Паездку на мора з маленькім дзіцем лепш планаваць у верасні-кастрычніку, калі сонца ўжо не будзе занадта пякучым. Усе паходы на пляж лепш перанесці на раніцу, каля 9 гадзін, або на вечар, пасля 5 гадзін. Абавязкова вазьміце з сабой парасон ад сонца.

Улічвайце, што першыя 10 дзён у дзіцяці будзе акліматызацыя, таму плануйце паездку на тыдні тры, не менш.

Купацца ў адкрытых вадаёмах можна дзецям не раней як у 1-1,5 года. Упэўніцеся, што вада адпавядае санітарным нормам.

Не выбірайце курорты з актыўным «начным» жыццём, каб не было спакусы вам і перашкоды спакойна адпачываць малому.

Прыемнага вам сямейнага адпачынку!

■ Вазьму твой боль...

# ГЕНЕРАЛЬНАЯ РЭПЕТЫЦЫЯ ЖЫЦЦЯ




Я пішу гэту калонку, напісаўшы два некралогі за адзін дзень. «Клуб 5000» страціў дваіх падапечных. Свет паменеў на дваіх чалавек. Дзве душы адляцелі ў небыццё. Смерць — гэта навіна, на якую актыўна рэагуюць нашы падпісчыкі, пакідаючы словы спачування бацькам. Яна ўскалыхвае. Яна заўсёды нечаканая. Для бацькоў. Для падпісчыкаў. Але не для нас, валанцёраў. Мы сочым за сітуацыяй і ведаем пра пагаршэнне стану. Мы загадзя чуем медыцынскія прагнозы, пра якія не скажаш прылюдна ў інтэрнэце, пакуль... пакуль не здарыцца. І я з жахам злавіла сябе на думцы, што загадзя прадумваю некралогі. Я складаю ў галаве факты, якія напішу пасля смерці чалавека, пукуль ён яшчэ жывы. Больш за тое — я пачынаю збіраць гэтыя факты адразу пасля знаёмства. Я аўтаматычна рыхтуюся да горшага, шчыра спадзяючыся на лепшае.

Не так даўно наш дабрачынны рух выйшаў на сувязь з італьянскай клінікай, дзе прапануюць эксперыментальнае лячэнне безнадзейна хворым. Усё, што трэба, каб трапіць туды, — выпіска з бальніцы аб тым, што лячэнне скончана і магчымых пратаколаў выратавання больш не існуе. Дык вось гэта лячэнне мы прапанавалі абодвум падапечным, якіх сёння не стала. У абодвух на руках быў эпікрыз з прысудам, абодва шукалі альтэрнатыўныя варыянты і панікавалі ў разгубленасці.

Эксперымент. Гэта тое, што можа атрымацца, а можа быць і няўдалым. Гэта тое, што не дае гарантыі. Тое, што можа як дапамагчы, так і пагоршыць сітуацыю. Эксперымент непрадказальны. Эксперыментальнае лячэнне для тых, каму няма чаго губляць. Для тых, хто можа дазволіць сабе рызыкнуць. Але яшчэ ніхто з нашых падапечных — безнадзейна хворых, якія вычарпалі ўсе магчымыя варыянты медыцыны — не пагадзіўся на такую рызыку.

Калі б жыццё было генеральнай рэпетыцыяй і мелася магчымасць паспрабаваць эксперыментальны варыянт, а потым, калі не атрымаецца, вярнуцца назад і прайграць па-новай, мы б рызыкавалі часцей.

Я чытаю кніжку і літаральна падштурхоўваю гераіню да дзеяння. Збоку ўсё выглядае відавочным. Надакучлівы муж, сумны шлюб, паступовае згасанне ў будзённасці. І вось ён, мужчына яе мары, з'явіўся на гарызонце — чакае, заве, распасцёр абдымкі. Прыгожы захад сонца, мора і вецер у валасах. Толькі бяжы насустрач свайму шчасцю, падбіраючы падол доўгай сукенкі. А яна ў сумневах. А калі не атрымаецца? Калі ён акажацца не прынцам? Назад да мужа ўжо не вернешся. І рэпутацыю ў грамадстве не атрымаеш. Раптам не склаздецца? А што, калі я дарэмна не цаню, тое што маю? Што будзе, калі згублю ўсё? Ідзі-ідзі, дурненькая, ты будзеш шчаслівай хоць нейкі час. Не ўпускай сваю магчымасць. А потым аўтар што-небудзь прыдумае для цябе. Аўтар кнігі. Ён можа перакрэсліць увесь сюжэт і напісаць па-новаму. Ён можа рызыкаваць і ладзіць генеральны прагон.

**Надакучлівы муж, сумны шлюб, паступовае згасанне ў будзённасці. І вось ён, мужчына яе мары, з'явіўся на гарызонце — чакае, заве, распасцёр абдымкі...**

Мы можам уяўляць сабе, што будзе, калі... Можам строіць планы і рызыкаваць. А можам пралічыць самыя нежаданыя прагнозы і спасаваць перад імі. Можам пабаяцца тых самых прагнозаў і ніколі не даведацца, ці спраўдзяцца яны.

Лёгка штурхаць гераіню ў абдымкі кахання і цяжка вырашыцца на змены ў сваім жыцці. Лёгка прапаноўваць эксперыментальнае лячэнне невылечна хвораму і цяжка прымірыцца са сваёй смерцю. Я разумею, чаму яны адмовіліся. Таму што безнадзейным хворым таксама ёсць што губляць. Лішні дзень, лішняя хвіліна побач з блізкімі перад вечнасцю ў іншым вымярэнні. Апошняя надзея на цуд і выбар паміж мноствам альтэрнатыўных варыянтаў, якія цяпер прапануюць ад авангардных навукоўцаў да шарлатанаў. І трэба не памыліцца з выбарам. У жыцця няма генеральнай рэпетыцыі, няма кантрольнага прагону. Ёсць толькі адна магчымасць. Усяго адзін выбар. І з ім нельга прамахнуцца.

У мяне доўгі час адсутнічала пачуццё самазахавання. Я кідалася ў самыя небяспечныя авантуры, ніколі не думала пра наступствы і не баялася пабочных эфектаў. Я не планавала, што будзе пасля прыгоды і чым яна можа скончыцца.

Страх перад невядомым з'явіўся пасля аварыі, калі цуд уратаваў маё жыццё. Я ўжо ніколі не асмелюся скокнуць з парашутам, абыду за паўкіламетра вясёлы атракцыён. Мала таго, што я ні за што не палезу на яго, дык яшчэ перасцерагуся, каб знянацку не зваліўся мне на галаву. Я больш не шукаю прыгоды і не рызыкую. Я стаўлю на жыццё. Але вось у чым праблема — ніхто не ведае, дзе той сектар, куды ўпадзе шарык. І магчыма, я паставіла не на той.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**

■

# «ЗАХАЦЕЛАСЯ СТАЦЬ БОЛЬШ НЕЗАЛЕЖНАЙ»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Калі Ульяна гасцюе ў бабулі, яны разам займаюцца ёгай.

## «Выходзіла з машыны з мокрай спінай...»

Мы размаўляем пра жыццё, пра апошнія падзеі і змены ў ім, і Святлана Пятроўна расказвае, як год таму, у 60 — яны разам з калегай пайшлі на курсы ваджэння. «Захацелася стаць больш незалежнай», — тлумачыць суразмоўца.

— У нашай сям'і ўсе ўмеюць кіраваць машынай: і муж, і дзеці. Муж адразу нават трохі здзівіўся, маўляў, навошта гэта табе трэба? Я адказала: «Не магу ўвесь час ад цябе залежаць, хочацца і самой вырашаць свае пытанні».

Час цяпер такі, патрабуе мабільнасці. У мяне дзеці дарослыя, унукі — хочацца і ім дапамагчы. Цяпер рабіць гэта стала прасцей. І ў цэлым, цяпер я захацела кудысьці — села і сама паехала...

***— Ці цяжка было вучыцца?***

— Няпроста, — не хавае праўды Святлана Пятроўна. — Аўташколу мы асабліва не выбіралі, галоўнае, каб была бліжэй да работы. Але, як аказалася, не памыліліся. Мне трапіўся вельмі добры інструктар, ну проста ад Бога. Алег Багдановіч мяне адразу папярэдзіў, што будзе цяжка. І праўду казаў. Я выходзіла з машыны, нягледзячы на холад, заўсёды з мокрай спінай. Але інструктар заўсёды мяне падтрымліваў і падбадзёрваў, шмат жартаваў... Я хадзіла да яго як на свята, нягледзячы на тое, што быў лістапад і, адпаведна, холадна, мокра, пахмурна. А калі здала экзамен па ваджэнні, то, выскачыўшы з машыны, гатовая была скакаць ад радасці!

Цяпер, калі еду ў якасці пасажыркі, гляджу, ці прытрымліваецца муж правілаў, раблю заўвагі, калі што...

***— Цяпер вы можаце цалкам прафесійна адказаць на пытанне: як ездзяць беларускія кіроўцы?***

— Большасць нашых вадзіцеляў ездзяць акуратна, хоць часам бываюць і супрацьлеглыя прыклады. Тады толькі глядзіш і здзіўляешся: як так можна? Падрэзаць адзін аднаго, пераскокваць з паласы ў паласу, проста як у камп'ютарных гульнях... Добра, што з такім сутыкаешся нячаста.

***— А з непавагай з боку кіроўцаў-мужчын сутыкаліся?***

— Не, не даводзілася. Адзін раз толькі быў нейкі выкрык з іншай машыны. Можа, таму, што павольна ехала. Але гэта быў не беларус, а выхадзец з Каўказа...

## 20 гадоў таму пачала займацца ёгай

— Пасля таго як я атрымала правы кіроўцы, я чарговы раз сябе запаважала, — усміхаецца наша гераіня. — Мы з калегай (ёй 55 гадоў) былі самыя ўзроставыя ў вучэбнай групе, усе астатнія — моладзь. І, ведаеце, мы аказаліся самымі дысцыплінаванымі і адказнымі курсантамі. Заўсёды своечасова здавалі залікі, з першага разу. Але іншыя таксама стараліся, проста, можа, з-за працы, з-за таго, што дзеці маленькія ў іх... не ўсё адразу атрымлівалася.

Наогул, у нас выдатная моладзь. Я ўжо 10 гадоў працую ў студэнцкай паліклініцы і бачу гэта. З сучаснымі студэнтамі лёгка мець зносіны, многія адказна ставяцца да свайго здароўя. Маладыя людзі цяпер цікавяцца правільным харчаваннем. Калі ў мужа быў дзень нараджэння, я сказала: «Ну што, торцік?» А мае дзеці адказалі: «Не, мама, не купляй торцік, лепш купім садавіны». Моладзь разумее каштоўнасць здароўя. Яны займаюцца фітнесам, спортам .... Гэта добрая мода, пагадзіцеся.

Я сама шмат гадоў займаюся ёгай. А пачала — у 40 гадоў, схадзіўшы на курсы Міжнароднага фонду «Мастацтва жыцця».

**«Калі толькі стала займацца ёгай, перажывала, што, можа, гэтым я здраджваю праваслаўнай рэлігіі, але потым зразумела: гэта не так. Рэлігія — гэта толькі абгортка для веры, і менавіта вера — самае галоўнае. Галоўнае, каб яна была ў сэрцы...»**

Раней, калі мне было 30 гадоў, я не магла нават 10-15 хвілін адстаяць у чарзе — мне балела спіна, паясніца. Не магла працаваць на лецішчы... Калі стала займацца ёгай, боль сышоў. Умацаваўся пазваночнік, і цяпер іншы раз муж не можа зрабіць на лецішчы тое, што магу я. Папрацаваць з рыдлёўкай? Без праблем. Трэба падкасіць траву ручной касой? Я бяру і іду касіць. Мая спіна прыйшла ў парадак, як і нервы таксама. І ад бранхіяльнай астмы я вылечылася, хоць справа даходзіла ўжо да таго, што мне патрабаваліся гарманальныя прэпараты.

Я заняткі ёгай наведваю да гэтага часу і дома сама займаюся. Не атрымліваецца раніцай (я па натуры сава), тады вечарам, калі ўсе ўжо лягуць спаць — я дыван разаслала і займаюся...

## Галоўнае, каб вера была ў сэрцы

— Пасля таго як я пачала займацца ёгай, у мяне ў корані змянілася жыццё, — прызнаецца Святлана Пятроўна. — Я навучылася быць удзячнай за ўсё, што здараецца ў маім жыцці. Усё цяпер зусім па-іншаму ўспрымаецца, нашмат лягчэй перажываю нейкія непрыемныя моманты.

Цяпер я разумею, што ўсё ў нашым жыцці не выпадкова. Наогул, шмат стала цікавага ў мяне адбывацца. Я ніколі не думала, што пабываю ў Індыі, напрыклад. Ад яе засталіся вельмі моцныя ўражанні. Асабліва ад акіяна з яго магутнымі прылівамі і адлівамі і вадой, што цяплейшая за чалавечае цела. Ад экзатычнай прыроды, шумных індыйскіх рынкаў...

Вядома, галеча там страшэнная, але індусы вераць, што калі ў гэтым жыцці яны бедныя, то ў наступным будуць жыць вельмі добра. Таму жабракі там ляжаць на тратуарах, на траве — і пры гэтым цалкам шчаслівыя! Усе задаволеныя, вочы ва ўсіх ззяюць. Хоць, вядома, выгляд маленькіх дзяцей з ручкамі-ножкамі, як палачкі, і велізарнымі ад недаядання жыватамі мяне ўразіў. Я нават плакала ад убачанага.

Як доктар я цікавілася там некаторымі момантамі, напрыклад, у кафэ назірала, як выконваюцца правілы гігіены. І хачу сказаць, што, у прынцыпе, у мяне засталіся нармальныя ўражанні: там ёсць халадзільнікі, гарачая і халодная вада, усё чыста — санітарныя нормы выконваюцца.

**«Умацаваўся пазваночнік, і цяпер іншы раз муж не можа зрабіць на лецішчы тое, што магу я. Папрацаваць з рыдлёўкай? Без праблем. Трэба падкасіць траву ручной касой? Я бяру і іду касіць».**

Індыя вельмі супярэчлівая краіна, яна захапіла мяне, але ментальна бліжэй Германія. Мне падабаецца дысцыпліна, дакладнасць, адказнасць, парадак.

...Яшчэ я пабывала ў Ерусаліме, хоць раней таксама ніколі не думала, што гэта адбудзецца. Я веруючы чалавек, кожны дзень малюся і за сябе, і за сваіх родных і блізкіх, і за краіну ў цэлым. Калі толькі стала займацца ёгай, перажывала, што, можа, гэтым я здраджваю праваслаўнай рэлігіі, але потым зразумела: гэта не так. Рэлігія — гэта толькі абгортка для веры, і менавіта вера — самае галоўнае. Галоўнае, каб яна была ў сэрцы...

***

***Вось такія цікавыя размовы... Вось такія цікавыя разважанні. Хочаце пагаварыць з цікавым чалавекам? Наступны раз звярніце ўвагу на суседа ці суседку або калегу па рабоце. Проста пагаварыце і пастарайцеся пры гэтым чуць не сябе, а чалавека насупраць. І вы лішні раз пераканаецеся, што выраз «кожны чалавек — гэта Сусвет» — не проста прыгожыя словы. Так і ёсць насамрэч.***

**Святлана БУСЬКО,**
*busko@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

■ Карысныя парады

# ЧЫМ ЗАНЯЦЦА НА ПЕНСІІ?

**Нарэшце вы выйшлі на пенсію! Ці, можа, гэтая падзея зусім не радуе вас? Баіцеся, што з'явіцца маса вольнага часу (якога так не хапала раней, калі вы з 9.00 да 18.00 сядзелі на працоўным месцы) і не будзеце ведаць, куды сябе падзець ад нуды? Дазвольце развеяць гэтую боязь і пераканаць вас у тым, што на пенсіі свабоднае, гарманічнае і цікавае жыццё толькі пачынаецца.**

## ПАРАДА № 1. Больш рухаемся

Калі ў вас за апошнія гады ўтварыліся непрывабныя складачкі на жываце ды сцёгнах і з'явілася лішняя вага, то цяпер самы час заняцца сабой. Пачніце з ранішняй гімнастыкі (з самых простых практыкаванняў) паступова павялічвайце колькасць паўтораў, дадавайце новыя, калі ёсць магчымасць — запішыцеся ў басейн побач з домам або на заняткі ёгай. Памятайце, што жыццё — гэта рух.

## ПАРАДА № 2. Разбіраем гардэроб

Вы калісьці нядрэнна вязалі або пачыналі шыць, але потым з-за адсутнасці часу закінулі? Чаму б не ўспомніць гэтыя навыкі зараз? А калі і не спрабавалі ніколі — паспрабуйце. Хіба не прывабна выглядае перспектыва нашыць і навязаць сабе (ды сваім блізкім) сімпатычных утульных рэчаў?

Працягвайце сачыць за моднымі трэндамі, хадзіце па крамах. На распродажах можна танна купіць прыгожыя і стыльныя рэчы. Выкіньце з шафаў (а лепш раздарыце!) тое, што ўжо надакучыла вам або не падыходзіць па памеры. Выхад на пенсію — не падстава выглядаць непрыгожа і нямодна!

## ПАРАДА № 3. Пачынаем правільна харчавацца

Карысная і здаровая ежа — залог актыўнага даўгалецця. Калі да пенсіі вы ўвесь час перакусвалі на бягу, елі ўсухамятку, злоўжывалі вострымі і салёнымі прадуктамі, то заняцца на пенсіі правільным харчаваннем — гэта ваш абавязак перад уласным арганізмам. Пачніце калекцыянаваць і асвойваць рэцэпты менавіта карыснай і здаровай ежы. І ўжо праз некалькі дзён вы заўважыце, як палепшылася ваша страваванне. Прыемным бонусам стане выдатнае самаадчуванне.

## ПАРАДА № 4. Чытаем класіку

Так-так, вось такая нечаканая, але вельмі эфектыўная парада. Што робяць пенсіянеркі, седзячы дома? Глядзяць тэлевізар, а менавіта серыялы, ток-шоу, крымінальныя навіны і іншыя перадачы, якія «засмечваюць мазгі». А ў выніку — стомленасць, негатыўныя эмоцыі... Яно вам трэба? Вядома, не. Вось я і заклікаю перачытаць вечнае — класіку, якая ніколі не выйдзе з моды. Калі вы працавалі, ці шмат у вас было часу на гэта? Шамякін, Гогаль, Кундэра — успомніце гэтых аўтараў, калі вы чыталі іх калісьці даўно, або адкрыйце для сябе дзівосны свет літаратуры першы раз! Пры гэтым зусім не абавязкова купляць дарагія тамы ў прыгожых вокладках у кнігарні — проста схадзіце ў бібліятэку!



## ПАРАДА № 5. Гуляем і падарожнічаем

Не замыкайцеся ў чатырох сценах. Падыдуць любыя віды прагулак — у парку, па горадзе. Схадзіце на тыя вуліцы, дзе вы даўно не былі, паглядзіце, як яны змяніліся. Знайдзіце ў бібліятэцы добрую кнігу па гісторыі вашага горада і прагуляйцеся па тых мясцінах, якія ў ёй апісваюцца. Не прапускайце выставы і экспазіцыі (пра іх звычайна пішуць у газетах і паведамляюць у навінах) — вы можаце наведаць іх у будны дзень без спешкі і таўкучкі, і значна танней. Калі вы жывяце ў вёсцы, знайдзіце сабе аднадумцаў, з якімі вы зможаце хоць зрэдку завітаць у суседнія гарады на экскурсію.

Скарыстайцеся магчымасцямі інтэрнэту — нават калі фінансы не дазваляюць з'ездзіць туды, куды хочацца, вы заўсёды можаце пракласці свой уласны віртуальны маршрут па замках Францыі або фіёрдах Нарвегіі.

***Адным словам, займайцеся тым, што прыносіць менавіта вам пазітыўныя эмоцыі, спрыяе добраму самаадчуванню, бадзёрасці духу і ўмацаванню здароўя. Напаўняйце кожны свой дзень такім справамі, і сумаваць і маркоціцца на пенсіі вам дакладна не давядзецца.***

**Падрыхтавала Наталля МАЎЧАНАВА**

■

# РАСЦІ, БАРАДА, РАСЦІ!



Не толькі жанчына ў цырульні патрабуе да сябе шмат увагі.

## Успрыманне. Нарвежац ці Ісус

Маё знаёмства з барадой адбылося ў дзяцінстве і было надта драматычным. У нейкі момант бацька на некаторы час вырашыў стаць барадачом. І калі пасля доўгага перапынку я ўбачыў яго, дык проста не пазнаў, што выклікала ў мяне пратэст і істэрыку. З тых часоў тату з барадой я больш не бачыў.

Стаўленне блізкіх да барады бывае своеасаблівым. Дзеткі, напрыклад, бачаць у ёй цацку, часам так і хочуцца яе патузаць. Але больш цікавае ўспрыманне незнаёмых, тых, хто цябе не ведае. Рэакцыя бывае нечаканай. Вось свежы прыклад.

— Нарвегія! — пачуў нядаўна, калі выходзіў з крамы і накіроўваўся дадому. — Ці чуеш мяне, Нарвегія?

Я азірнуўся. Перада мной стаяў звычайны мужчына. Праўда, ягонае здзіўленне ад убачанага было бязмежнае, як Прыпяць падчас паводкі.

— Дакладна нарвежац, — дадаў дзядзька. — Як у кіно!

Для яго дзіва, а для мяне завядзёнка, да якой ужо прывычаіўся. Нарвежац, швед, ісландзец і нават амерыканец. З-за сваёй рудаватай барады, якую пачаў насіць гады тры таму, з лёгкай падачы прахожых я стаў чалавекам свету. Не менш цікавыя гісторыі адбываліся з калегам, журналістам Мікітам Мелказёравым, што насіў чорную шырокую бараду.

— Калі ты носіш бараду, цябе многія пачынаюць лічыць каўказцам альбо нават... баевіком, — прыгадвае Мікіта. — Нейк ехаў у аўтобусе. Трымаў у вушах навушнікі, хоць музыку не слухаў. Непадалёк сядзелі два дзядзькі і абмяркоўвалі мяне: «О, хлопец чачэнец!» — «Ды не, не ён». Чуць усё гэта ад іх, чачэнец я ці не чачэнец, мне было даволі весела. А калі я ішоў па сваім раёне ў капюшоне, мужчыны нападпітку назвалі мяне Ісусам. Хто ведае, можа я выклікаў у іх пачуццё прасвятлення?

**«У кожнага свая барада. Але тыя, якія растуць дрэнна, нераўнамерна, астраўкамі, стрыгчы складана. Такія немагчыма прывесці ў аптымальны стан».**

Мікіта Рочаў — гулец футбольнага клуба «Іслач». Ён, напэўна, адзін з самых барадатых футбалістаў вышэйшай лігі. Носіць бараду ўжо чацвёрты год і наслухаўся таксама рознага.

— Партнёры па камандзе да маёй барады ўжо прызвычаіліся, — кажа Мікіта. — Але першапачаткова жартавалі, называлі тэрарыстам і проста барадатым. Але ўсё гэта працягвалася зусім нядоўга.

## Прычыны. Лянота і спрэчка

У адзін цудоўны дзень я прачнуўся і ўбачыў, што па Мінску ходзіць шмат такіх, як я. Толькі ў адных барада даўжэйшая, у другіх — карацейшая. Нарвацца ў транспарце на свайго «брата» лёгка. Прычыны, чаму ў апошнія гады рэзка беларусы пачалі барадзець, многія звязваюць са з'яўленнем хіп-



Адзін з кліентаў барбершопа распавёў, што носіць бараду ўжо... 40 гадоў!

стараў, маладзёжнай субкультуры. Адным з галоўных атрыбутаў хіпстараў называюць менавіта бараду. Але жаданне яе насіць прыйшло да мяне само па сабе. І дакладна без пабочных уплываў. З-за адчувальнасці скура хутка раздражнялася, і я вырашыў проста не галіцца. Вынік мяне цалкам задаволіў. А вось Мікіта Рочаў пачаў насіць бараду пасля спрэчкі з сябрам.

— Сказаў, што не буду галіцца паўгода, — прыгадвае Рочаў. — Цяпер нашу яе пастаянна. І не таму, што модна. Я лянуюся галіцца. Калі становіцца вельмі вялікай, іду стрыгчы ў цырульню. Сам раблю гэта вельмі рэдка.

— У мяне заўжды ўсё добра на твары расло, — гаворыць Мікіта Мелказёраў. — У пэўны момант з'явілася гэтае хіпстарства: модныя барбершопы, цырульні для мужчын, шмат інфармацыі пра догляд барады. Мне здалося, што гэта будзе даволі весёлы выклік. Захацелася адгадаваць бараду. Каб была не проста шчэць, а вялікі масіў! І паспрабаваў. У мяне адрасла даволі вялікая барада. Але я адмовіўся ад яе. Цяпер у мяне сантыметровая нарасць.

## Месца. Цырульні для барадатых

Стрыгчы бараду можна было і ў звычайных цырульнях, але тры гады таму ў Мінску з'явіўся FIRM, першы барбершоп (месца, дзе робяць не толькі стыльныя прычоскі, але стрыгуць і робяць прыгожай бараду). Калі ўпершыню туды прыйшоў, адразу ўразіла атмасфера. Замест хлюпікаў-мадэляў на фотаздымках моцныя татуіраваныя хлопцы з паголенымі скронямі і акуратнымі барадамі. Гучала прыемная музыка. Мне адразу прапанавалі каву, а Аляксей, мой цырульнік, аказаўся вельмі ветлівым хлопцам і адразу пачаў распытваць, нешта раіць. Увесь працэс заняў хвілін сорак. Напрыканцы бараду намазалі бальзамам, і я выйшаў з барбершопа з цвёрдым намерам туды вярнуцца.

Праз некаторы час яны пачалі «расці» ў Мінску, як грыбы пасля дажджу. І цяпер спецыялізаваных цырульняў для мужчын і барадачоў у сталіцы каля дзесяці.

— Барада — гэта і стыльна, і модна для мужчыны, — кажа Альберт, цырульнік барбершопа «El Cartel». — Відаць, што мужчыны пачынаюць даглядаць сябе. Да нас ідзе ўсё больш і больш людзей. Мы толькі нядаўна адкрыліся, і графік распісаны з першых дзён.

**— Якія бароды найчасцей стрыжаце?**

— Апошнім часам вялікія пачынаюць выходзіць з моды. Цяпер усё больш мужчын носяць невялічкія акуратныя бароды. Хоць з доўгімі да нас таксама прыходзяць. Зразумела, у кожнага свая барада. Але тыя, якія растуць дрэнна, нераўнамерна, астраўкамі, стрыгчы складана. Такія немагчыма прывесці ў аптымальны стан. Нашмат прасцей, калі волас прамы. У такім разе барада хутка набывае неабходную форму.

**— Мужчыны якога ўзросту пераважна прыходзяць у барбершоп?**

— Гэта вызначыць вельмі складана. Але мне падаецца, што большасці з іх каля трыццаці гадоў. Многія таты прыходзяць з дзецьмі.

## Догляд. Ад шампуняў да бальзаму

— Каб барада была годная, найперш трэба мець добрую генетыку, — працягвае Альберт. — Але каб яна яшчэ была больш паслухмяной, трэба дадаткова набываць касметыку.

Стрыжка барады ў барбершопе абыдзецца вам у 20—25 рублёў. Для кагосьці гэтая сума не вельмі прымальная. Таму можна паспрабаваць пастрыгчы яе самому — машынкай, прафесійнымі нажніцамі альбо звярнуцца ў звычайную цырульню. Калі барада тапырыцца, яе трэба мазаць спецыяльнымі бальзамамі. Невялічкая каробачка для ўкладкі барады абыдзецца прыкладна ў 50 рублёў, сродак, які стымулюе рост барады, — у 33 рублі. Ёсць таксама мыла і шампунь, якія мусяць зрабіць вашу бараду яшчэ больш паслухмянай. Кошт іх складае больш за 20 рублёў. У асартыменце беларускіх крамаў ёсць нават воск, які дазволіць зрабіць вашыя вусы падобнымі на тыя, што насіў Сальвадор Далі. Нягледзячы на ўсё гэта, ёсць адно правіла, якое варта выконваць абавязкова. Бараду трэба даволі часта мыць. А якімі сродкамі — звычайным шампунем, мылам ці не — вырашаць ужо вам.

**Бацька на некаторы час вырашыў стаць барадачом. І калі пасля доўгага перапынку я ўбачыў яго, дык проста не пазнаў, што выклікала ў мяне пратэст і істэрыку.**

**Ёсць адно правіла, якое варта выконваць абавязкова. Бараду трэба даволі часта мыць. А якімі сродкамі — вырашаць ужо вам.**

## Увага дзяўчат. Ад любові да непрымання

Барада — штука даволі спецыфічная. Асабліва, калі набывае значныя памеры. А таму не дзіўна, што некаторыя жанчыны яе не любяць. Канадскі хакеіст-барадач Джон Торнтан неяк прызнаўся, што жонка ненавідзіць ягоную вялікую бараду, але ў сям'і з'явіўся кот, які любіць залазіць у яе лапкамі. Мікіта Рочаў таксама прызнаўся, што напачатку барада выклікала крытыку. Асабліва з боку бабуль.

— Але маёй каханай яна падабаецца, — дадае Мікіта. — І яна яшчэ не прасіла, каб я з барадой развітаўся. Просіць, каб галіўся толькі тады, калі яна становіцца вялікай.

Аднак, каб сапраўды зразумець, ці падабаюцца беларускім дзяўчатам барадатыя мужчыны, «Звязда» правяла апытанне. Агулам прагаласавала 188 жанчын. 25 працэнтаў прызналіся, што ставяцца да іх адмоўна, 20 наадварот выказалі сваё захапленне. Але большасць прагаласавала за тое, што барада — гэта не істотна, бо ўсё залежыць ад чалавека. І толькі 16 дзяўчат сказалі, што «барадачы іх ужо задзяўблі»! Што сказаць, памяркоўнасці нашых дзяўчат няма межаў...

**Якаў ЖУРБІН.**



Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# «ГЭТА НЕ Я ГЕРОЙ, А СЯРОГА»

## Гісторыя сапраўднага мужчынскага сяброўства


Фота Надзеі БУЖАН.

**Ігар Буцер і Сяргей Поляк сябруюць з юнацтва. Абодвум — крыху за 40. Жывуць у адной кватэры ў Вілейцы, не разумеюць, чаму моладзь любіць перапісвацца праз сацыяльныя сеткі, а не збірацца ў двары, і маюць на дваіх паўтысячы рублёў у месяц. З іх 350 — Сяргеева пенсія па інваліднасці. Мужчына не ўстае: пасля няшчаснага выпадку рукі і ногі паралізавала. Сядзелку апошнія 15 гадоў яму замяняе Ігар. «Я ўжо медбрат, — смяецца той. — Мне дакумент хутка выдаваць можна будзе».**

**Пра разумныя тэхналогіі, цану аднаго скачка і сапраўднае сяброўства — у нашым рэпартажы.**

### Манітор на вешалцы і найсмачнейшыя супы

— Ужо месяц Сярога сам па сабе. Усё, чалавек прапаў! Зацягнула сусветная павуціна, — жартуе Ігар пра свайго сябра, прапускаючы нас у кватэру.

Сяргея мы засталі за камп'ютарам. Нечакана. Манітор падвешаны на «перакладзіну» над ложкам. З дапамогай спецыяльнай праграмы мужчына сам можа кіраваць мышшу. «Камера сочыць за рухамі галавы, клік аўтаматычны, калі на месцы затрымліваюся», — тлумачыць нам Сяргей прынцып работы сістэмы, з якой сам пазнаёміўся зусім нядаўна.

— Маё жыццё змянілася, — радуецца ён новай праграме. — Цяпер магу навіны сам пачытаць. Раней, пакуль Ігар не прыйдзе — нічога не ведаю. І патэлефанаваць яму праз інтэрнэт магу, калі ён кудысь адышоў па сваіх справах.

Перакладзіну, да якой мацуецца манітор, замяняе звычайная вешалка на колцах. Самі з сябрамі прыдумалі, хваліцца Ігар.

— Збіраліся спачатку столік спецыяльны купіць. У нас яго не знайшлі, трэба было з Расіі везці. Два мільёны каштавала б (да дэнамінацыі. — **Аўт.**). А вешалка — усяго 300 тысяч. У жонкі сябра, Людкі, павільён гандлёвы ў Мінску. Яны гэту штуку прывезлі нам.

На Ігары — роля хатняй гаспадыні. І, трэба сказаць, спраўляецца ён нядрэнна. У кватэры ідэальны парадак — нават не скажаш, што халасцяцкая.

— Я такі гаспадарлівы чалавек. Бачыш, якія мы класныя фоташторы купілі? — паказвае Ігар на яркія трапічныя фіранкі. — Сярога пад пальмай ляжыць! Пазітыў!

З меню ў сяброў таксама ўсё нармальна. Гатаванне Ігар асвоіў.

— У мяне супы якія! Другія стравы не вельмі, але супы... Сябры сказалі: ні ў аднаго жонка такога не робіць. Гэтым магу пахваліцца. Гады трэніровак, але я навучыўся іх варыць.

У планах гаспадарлівага сябра — выбіць для Сярогі новы спецыяльны матрац (гэты ўжо пачаў асыпацца) і ўзяць дадому ката («З жывёлай весялей усё ж такі»).

### «Усплыў спінай, а хлопцы думалі, што жартую»

Ад надзённага вяртаемся да таго, што здарылася 23 гады таму. Сяргей, тады яшчэ малады хлопец, толькі вярнуўся з арміі (служыць давялося ў Туркменістане) у родную Вілейку. Сабраліся з кампаніяй на раку. Ныралі там ужо не першы раз: раней глыбіня была метры тры з паловай. Але пакуль хлопец быў у арміі, раку чысцілі, пяску нанеслі.

— Вады стала па пояс. А я нават ні на секунду не засумняваўся, — згадвае мужчына. — Дакладна ведаў, бо плаваў у гэтым месцы два гады таму. Па старой памяці ныраю, а там адразу дно... Я як усплыў спінай, зразумеў: усё аднялося. Не адчуваю ні рук, ні ног. Быў у прытомнасці. Сябры хутчэй выцягнулі мяне. Кажу ім: «Усё, хлопцы, хана. Пазваночнік». А яны думалі, што жартую.

Падаспела «хуткая». Дыягназ — пералом шыйнага аддзела пазваночніка з перакрыццём спіннога мозгу. Урачы давалі Сяргею тры дні. Прагнозы не спраўдзіліся.

— У Мінск на аперацыю баяліся везці, думалі, не перанясу дарогі. На свой страх мама падпісала дакументы, каб транспартавалі, нягледзячы ні на што. Дарога, вядома, далася ў знакі. Паднялася тэмпература. За ноч, напэўна, літры два гарэлкі мне на грудзі вылілі. Усё хутка выпаралася. Ніяк тэмпературу збіць не маглі. Дактары казалі, што калі так пойдзе, то праз тыдзень згару. Фактычна праз кожныя тры дні рабілі здымак лёгкіх. Баяліся, што запаленне падхаплю... Але, як той казаў, Гасподзь мілаваў.

**«Мы старой загартоўкі. Цяпер неяк кожны сам за сябе — у нас такога не было».**

— Што адчулі, калі зразумелі, што цяпер усё жыццё праведзяце на ложку? — такія пытанні задаваць заўсёды няёмка.

— Стала страшна. Ты ўсведамляеш, што не можаш зрабіць элементарныя рэчы — папіць, паесці. Трэба, каб хтосьці ва ўсім дапамагаў. Страшна, — слова «страшна» насамрэч прагучала больш разоў.

Спачатку Сяргея даглядала маці. Калі яе не стала, клопаты пра сябра ўзяў на сябе Ігар. Наведваць прыязджае таксама сястра Сяргея, якая жыве цяпер у іншым горадзе.

— Вас не палохала перспектыва быць сядзелкай? Усё ж такі не мужчынская работа...

— Ніхто пра гэта не думаў. Рашэнне неяк само прыйшло, — расказвае Ігар і просіць не выстаўляць яго героем: гэта Сярога малайчына, што не ўпаў духам. — Раней медсястра прыходзіла, тут побач жыве. Але трэба ж вучыцца: што ты, кожны раз чалавека адрываць будзеш? У яе ж свае справы. Спачатку цяжка было, але да ўсяго прывыкаеш. Я сам раблю перавязкі, перасцілаю ложак. Раней трэба было кагосьці клікаць, каб патрымалі на баку Сяргея, а цяпер прылаўчыўся.

Замест заробка ў Ігара — дапамога па доглядзе інваліда. Прыкладна 170 рублёў у месяц. «Ды хапае нам. Што, дзяцей карміць трэба? Не бядуем. З нашымі цэнамі ў Вілейцы можна жыць. Тым больш перавязачныя матэрыялы бясплатнымі нам зрабілі».

### Кампанія ў 15 чалавек і сапраўдныя эмоцыі

На навенькім серванце ў некалькі шэрагаў стаяць пяцідзесяціграмоўкі. Ігар заводзіць размову пра алкаголь.

— Сябры прыходзяць — часам можам і па сотцы выпіць. За сустрэчу. А так, кінуў я гэту справу. Запойны чалавек, таму нельга мне. Гадоў дзесяць ужываў. Можа, Сярога дапамог кінуць, хто яго ведае. Можа, ён за мяне Божаньку слоўца замовіў. Так бы ўжо дзе-небудзь памёр ад «вадзяры».

Мы тым часам гартаем альбом з фотаздымкамі. Многія зроблены ў гэтым пакоі, і амаль на кожным з іх — вялікая кампанія. «У нас як было раней 15 чалавек сяброў, так і засталося. Яны нікуды не разбегліся. Наадварот, мы неяк больш з'ядналіся. Сем'і ў некаторых, але ўсе наведваюць», — з непрыхаваным гонарам расказваюць мужчыны пра сваю кампанію.

Самі яны абзавесціся сем'ямі не паспелі. Дзяўчына, з якой некалі сустракаўся Сяргей, замужам за іншым, мае дваіх дзяцей. Але перапісваецца з Сяргеем у сацыяльных сетках.

— А вы не шкадуеце, што не ажаніліся? — пытанне Ігару.

— Ды не, нармальна, я прывык. Дзяўчына ёсць у прынцыпе. Дый у нас сябры некаторыя ўжо па два разы развяліся.

У тым, што іх сяброўства захавалася з юнацтва, мужчыны не бачаць нічога дзіўнага.

— Мы старой загартоўкі. Цяпер неяк кожны сам за сябе — у нас такога не было. Мы з дваццаці гадоў прывыклі дзяліцца ўсім. Адзін за другога парвём.

— Мне здаецца, многае яшчэ залежыць ад бацькоў, — заўважае Сяргей. — Мама заўсёды, калі прыходзілі мае сябры, усіх за стол саджала. Яны пераначаваць маглі застацца. І хлопцы ніколі дапамагчы не адмаўлялі.

Сваркі і крыўды, прызнаюцца мужчыны, часам бываюць. Як жа без гэтага? Але надоўга не зацягваюцца. Сябры пазлуюцца пару гадзін — і ідуць на міравую.

— Самае галоўнае для чалавека — стасункі. Без гэтага ты ніхто, — упэўнены Ігар. — Што табе камп'ютар дасць эмоцыі? Я не спрачаюся, ён патрэбен. Для такіх, як Сярога, гэта ўвогуле незаменная рэч, але не варта на тым інтэрнэце зацыклівацца.

— Пацан нам тэлефануе, таксама «шыйнік». Ён тры гады толькі ляжыць, — дзеліцца гісторыяй Сяргей. — У яго адзін-два сябры засталіся, больш ніхто не прыходзіць, забыліся. Застаўся адзін бядак. А ў іх яшчэ з маці такія напружаныя адносіны. Увогуле, жуда. Яна не саступае, ён не саступае. Прыйдуць бацькі, паесці дадуць, камп'ютар паставяць і ўсё. Ён кажа: я табе зайздрошчу... Можа, пашанцавала нам?

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Больш фота — на сайце www.zviazda.by**

Споведзь

# «У СВАЕ 39 Я ВУЧЫЛАСЯ ЖЫЦЬ НАНОВА»

**Прывыканне жанчын да алкаголю і поўная залежнасць развіваюцца надзвычай хутка. Жанна Аўсейчык, 42-гадовая жыхарка пасёлка Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна, ведае гэта дакладна. Жанчына раней была пазбаўлена бацькоўскіх правоў, вяла асацыяльны лад жыцця, нават трапіла за краты... Тым не менш, змагла рэзка змяніць сябе, свае паводзіны, погляды на жыццё.**


Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.

—ПРА сваё мінулае асабліва ўспамінаць не хочацца. Не толькі таму, што за плячыма дзве «адсідкі» ў месцах пазбаўлення волі. У гэтым мінулым не было ні любові, ні сэнсу... Няўдала складвалася жыццё маці, якая нацярпелася ад свайго вечна п'янага сужыцеля. Кепска стартавала ў дарослым жыцці і я, так бы мовіць, паплыла па цячэнні. Як вынік, зацяжарала і нарадзіла першае дзіця, хлопчыка, у 18 гадоў. Адносіны з першым мужам скончыліся, стала жыць з другім мужчынам — і цераз чатыры гады нарадзіла яшчэ аднаго хлопчыка.

У тым маім жыцці, як і ў жыцці маіх спадарожнікаў, значнае месца займаў алкаголь, было весела. Але пасля таго, як выйшаў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №18, стала зразумела: толькі «галівудзіць» у жыцці не атрымаецца, трэба сплачваць дзяржаве гадаванне маіх дзяцей. Стала імкліва нарастаць запазычанасць, прычым па ўсіх кірунках: камунальнікі папярэджвалі аб тым, што адключаць ваду. Святла ў канцы тунэля я не бачыла і, па праўдзе кажучы, не хацела бачыць. У рэшце рэшт у 2008-м трапіла зноў за краты: запазычанасць на выхаванне дзяцей дасягнула мяжы, іншага выйсця ў праваахоўнікаў і не было.

Не лічу, што зняволенне выпраўляе людзей. У калоніі, дзе адбывала пакаранне некалькі гадоў, я не сустрэла тых, хто б хацеў стаць іншым чалавекам, кардынальна змяніць сябе. Не, большасць сядзельцаў марыць пра жыццё, дзе вясёлыя кампаніі, алкаголь, бесклапотнае баўленне часу.

Асабіста для мяне жыццё нібы застыла. Я не бачыла ў ім ні мэты, ні сэнсу.

...АЛЕ аднойчы мне трапіла ў рукі Біблія. Я разгарнула гэтую кнігу, пачала чытаць. Не магу сказаць, што мне ўсё было добра зразумела, але ў кожным слове нібы мелася нешта настолькі гіпнатычнае, хвалюючае, што я не магла адарвацца. Чытаючы Біблію, стала заўважаць, што ў мяне нібы з'явілася абарона. Мне стала лягчэй жыць, я стала больш спакойнай і ўпэўненай, зразумела, што змагу пайсці супраць звыклага цячэння, бо Бог падараваў мне на гэта сілы. Я ўбачыла святло ў канцы тунэля... І ўжо спакойна чакала часу, калі выйду на волю.

На волі было вельмі цяжка пачынаць новае жыццё. У маёй двухпакаёўцы быў суцэльны бардак і вэрхал: вокны выбіты, падлога і сцены ў страшэнным стане, са столі, з месца, дзе павінна быць люстра, звісала груша для баксіравання.

Ад мяне адвярнуліся родныя, большасць з якіх жыве ў Ляхавіцкім раёне. Ніхто з іх не дапамог на новым этапе жыцця. А трэба было ў свае 39 гадоў станавіцца на ногі, каб жыць так, як людзі жывуць.

Праўда, у першыя дні пасля выхаду на волю пакаштавала піва — і падаўся мне гэты напой нясмачнай кісляцінай. У мяне былі іншыя думкі і іншыя планы. Паступова кінула і курыць.

На момант вызвалення з папраўчай калоніі даўгі перад дзяржавай за выхаванне дзяцей дасягалі некалькіх дзясяткаў мільёнаў рублёў, перад ЖКГ — каля васьмі мільёнаў. Я працаўладкавалася на ўчастак «Івацэвічырайгаз» бетоншчыцай.

Для жанчыны гэта вельмі цяжкая праца; большасць прадстаўніц слабага полу тут не вытрымалі б і тыдня, а ў мяне за тры гады ніводнага парушэння працоўнай дысцыпліны ці прагулу. Працаваць з мужчынамі нараўне, але на значна горшых умовах — гэта цяжка і фізічна, і маральна. Паколькі я абавязаная асоба, то працую толькі па дамове (мае калегі — па кантракце), мой водпуск — толькі сем дзён, на пагашэнне доўгу ідзе каля 70 працэнтаў ад маёй зарплаты. Атрымліваю штомесяц «на рукі» каля 45 рублёў. За гэтыя грошы трэба неяк жыць, аплачваць камунальныя паслугі (я поўнасцю пагасіла запазычанасць перад ЖКГ), апранацца, абувацца, харчавацца...

Але на самай справе грошай на гэта трэба не так і многа. Сёння людзі адмаўляюцца і гатовыя выкінуць на звалку рэчы, якія яшчэ ў добрым стане — мяккія «куткі», шафы, нават тэлевізары і халадзільнікі. Усё, што знаходзіцца ў кватэры, я набыла за сімвалічныя сумы, новыя толькі шпалеры і фарба для падлогі... Паступова і сума запазычанасці зніжаецца. Жыццё наладжваецца...

***Запісаў Аляксандр ГОРБАЧ***

# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Аношки, дер. Прилепы, дер. Дуброва, дер. Лужки, дер. Липники Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 31 августа 2016 года в 11.00, а.г. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, а.г. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, № 624883000201000114, дер. Аношки (участок 1)<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, № 624883008301000541, дер. Прилепы (по гп № 5)<br>Лот № 3 – площадь 0,0967 га, № 624885001601000127, дер. Дуброва<br>Лот № 4 – площадь 0,1500 га, № 624883005601000160, дер. Лужки (по гп № 4)<br>Лот № 5 – площадь 0,1299 га № 624883005101000243, дер. Липники (по гп № 1) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 25 000,00 рублей<br>Лот № 2 – 30 000,00 рублей<br>Лот № 3 – 10 000,00 рублей<br>Лот № 4 – 20 000,00 рублей<br>Лот № 5 – 20 000,00 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Аношки – подъездные пути, электричество, водоохранная зона р. Усяжа<br>д. Прилепы – нет<br>д. Дуброва – нет<br>д. Лужки – нет, водоохранная зона канала<br>д. Липники – подъездные пути, газ |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 13 | **Прием документов** | в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | **Окончательный срок приема документов** | 25 августа 2016 года до 17.00 |
| 14 | **Контактные телефоны** | 8 017 76 44 6 36, 68 0 30 |

Расходы по организации и проведению аукциона (Лот № 1 – 1 480,30 белорусского рубля, лот № 2 – 1 417,45 белорусского рубля, лот № 3 – 54,00 белорусских рубля, лот № 4 – 895,88 белорусского рубля, лот № 5 – 1 407,84 белорусского рубля и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

3. Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.



# ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 17 августа 2016 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Брест, ул. Д. Донцова, 6/1, каб. 33.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О реорганизации ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест в форме присоединения к ОАО «Спецмонтажстрой».
2. О возложении на управляющего Общества обязанности письменно уведомить кредиторов Общества и уполномоченные государственные органы о предстоящей реорганизации.
3. Об определении даты, по состоянию на которую производится инвентаризация имущества и составляется передаточный акт.
4. О предоставлении полномочий на подписание договора о присоединении и передаточного акта.
5. Об утверждении цены выкупа акций по требованию акционеров.
6. О назначении даты проведения общего собрания акционеров Общества по утверждению договора о присоединении.
7. Об утверждении изменений в устав Общества.

Местонахождение ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест: **г. Брест, ул. Д. Донского, 6/1, каб. 33.**

Место проведения собрания: **г. Брест, ул. Д. Донского, 6/1, каб. 33.**

Начало работы собрания **в 11.15.**

Регистрация участников собрания **с 10.45 до 11.10** в день проведения собрания. При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 10 августа 2016 г.**

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 01.08.2016, по месту нахождения Общества.

Орган, созывающий общее собрание: наблюдательный, основание созыва: протокол от 25.07.2016 № 25-07/2016.

УНП 200017199 ***Наблюдательный совет ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест***

Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска полис по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 1793668 **считать недействительным.**

УНП 100122726

# ПУХОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ, который состоится 2 сентября 2016 г. в 15.00 в зале заседаний райисполкома, расположенного по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227

Н А  А У К Ц И О Н  Б У Д У Т  В Ы С Т А В Л Е Н Ы:

**ЛОТ 1** – земельный участок (кадастровый номер 624450100001002655), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, м-н «Юго-Запад», ул. Цветочная, 4, площадь – 0,1025 га, для строительства и обслуживания жилого дома, начальная цена – 14 298,78 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 1 429,88 рубля.

Расходы, связанные с формированием земельного участка, – 108,45 руб.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения, газоснабжения.

**ЛОТ 2** – земельный участок (кадастровый номер 624450100001002651), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, м-н «Юго-Запад, ул. Цветочная, 6, площадь – 0,1000 га, для строительства и обслуживания жилого дома, начальная цена – 13 950,03 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 1 395,00 рублей.

Расходы, связанные с формированием земельного участка, – 100,05 руб.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения, газоснабжения.

**ЛОТ 3** – земельный участок (кадастровый номер 624485700031000039), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Руденский с/с, СТ «Новая Надежда», 67, площадь – 0,0780 га, для коллективного садоводства, начальная цена – 1 565,28 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 156,53 рубля.

Расходы, связанные с формированием земельного участка, – 1062,12 руб.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

**ЛОТ 4** – земельный участок (кадастровый номер 624485700031000040), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Руденский с/с, СТ «Новая Надежда», 39, площадь – 0,0799 га, для коллективного садоводства, начальная цена – 1 626,81 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 156,53 рубля.

Расходы, связанные с формированием земельного участка, – 1245,54 руб.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

**ЛОТ 5** – земельный участок (кадастровый номер 624485700033000065), расположенный по адресу: Минская область, Пуховичский район, Руденский с/с, СТ «Остров-Дружный», 208, площадь – 0,1000 га, для коллективного садоводства, начальная цена – 1 915,11 рубля, размер задатка для участия в аукционе – 191,51 рубля.

Расходы, связанные с формированием земельного участка, – 1017,25 руб.

Дополнительно возмещаются расходы за размещение объявления в газете «Звязда».

Имеется возможность электроснабжения

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на счет финансового отдела Пуховичского райисполкома, ф-л 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк» (код 601), сч. № 3600625000025, код платежа – 04616.

**Участники аукциона должны предоставить следующие документы:**

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, представляются:

- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявление на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, Пуховичский райисполком, 2-й этаж, к. 220 **с 22 августа 2016 г. по 25 августа 2016 г., с 8.00 до 13.00** по рабочим дням.

Заключительная регистрация – с 14.30 до 14.55 в день проведения аукциона по адресу: Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, 2-й этаж, к. 227, зал заседаний райисполкома.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победитель аукциона вносит плату:

- за право заключения договора аренды земельного участка (при проведении аукциона по аренде земельных участков)
- плату за приобретение земельного участка в частную собственность;
- возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и государственной регистрацией в отношении созданного земельного участка; получает разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительного проекта на строительство объектов в срок, не превышающий два года (для строительство домов и объектов целевого назначения)

Участники аукциона предварительно могут ознакомится с земельными участками, которые предлагаются для продажи в частную собственность по результатам аукциона, путем выезда на место нахождения земельного участка.

Дополнительную информацию можно получить по адресу: **г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, к. 220, контактный тел.: 8 01713 35879 с 8.00 до 13.00 по рабочим дням.**

# И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  Э Л Е К Т Р О Н Н Ы Х  Т О Р Г О В

## Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 2 сентября 2016 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги по продаже права заключения договора аренды земельных участков в г. Минске

**Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельных участков сроком на 5 лет.**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб./ в денежных единицах без учета деноминации | Сумма задатка, бел. руб./ в денежных единицах без учета деноминации | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб./в денежных единицах без учета деноминации | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск на территории Национального аэропорта «Минск» | 500000000004005614 | 2,2040 | для строительства объекта «Бизнес-центр с гостиницей и многоуровневым паркингом на территории Национального аэропорта «Минск»/ земельный участок для размещения объектов иного назначения | 15 604,42/ 156 044 166 | 2 340,00/ 23 406 615 | 5 469,29/ 54 692 920 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами – общая площадь здания ориентировочно 15 000 – 20 000 кв.м, функциональное назначение объекта – бизнес-центр с гостиницей и многоуровневым паркингом, состав объекта: офисно-деловая часть – 1 500 кв.м; гостиница на 120 мест (4 000 – 7 000 кв.м); многоуровневый паркинг до 12 000 кв. м, вместимость паркинга 600 маш.м; рестораны, кафе, бары 2 000 – 3 000 кв.м вместимостью 200 посадочных мест; холл «зимний сад» – 500 кв.м |
| 2 | г. Минск в районе ул. Брикета– МКАД (34 км) | 500000000006007843 | 3,5480 | для строительства объекта «Административно-деловой комплекс в районе ул. Брикета – МКАД (34 км)»/ земельный участок для размещения объектов административного назначения | 1 141 312,10/ 11 413 121 016 | 171 200,00/ 1 712 000 000 | 10 857,08/ 108 570 777 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: общая площадь здания комплекса (подлежит уточнению проектом): 38 400 кв.м, в том числе паркинга – 12 000 кв.м, функциональное назначение объекта – объект административно-делового назначения, состав объекта – административно-деловой комплекс со встроенным паркингом. Возместить Минскому районному унитарному предприятию «Агрокомбинат Ждановичи» упущенную выгоду в размере 524,11 руб. (5 241 140 руб. без учета деноминации); Возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства, вызванные изъятием пахотных земель площадью 0,7476 га для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства в размере 45 570,10 руб. (455 701 090 руб. без учета деноминации) на счет по учету средств республиканского бюджета по месту постановки на учет плательщика с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения. |

**Продавец:** Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости, 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 226 16 72, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

**Порядок проведения электронных торгов:** электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №608 (далее – Положение).

**Для участия в электронных торгах необходимо** ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП, а также оплатить оператору ЭТП компьютерные услуги согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП.

***Задаток перечисляется на на расчетный счет № 3012104971019 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, 220035 г. Минск, просп. Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – 29.08.2016 г.***

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.

**Дата и время начала проведения электронных торгов:** 2 сентября 2016 года в 11.30 (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

**Победитель** электронных торгов либо претендент на покупку, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5%, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

**Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:**

по земельному участку для строительства объекта «Административно-деловой комплекс в районе ул. Брикета–МКАД (34 км)» – 171 200,00 бел. руб. (1 712 000 000 руб. без учета деноминации);

по земельному участка на на территории Национального аэропорта «Минск» – 2 340,00 бел. руб. (23 406 615 руб. без учета деноминации).

**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по 29.08.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017)2261672.

Извещение о проведении аукциона в отношении земельного участка в районе ул. Брикета–МКАД (34 км) ранее было опубликовано 24.08.2015 г., 22.10.2015 и 10.02.2016 в газете «Звязда».

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by).

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЗА ЎСЁ — ДЗЯКУЙ БАЦЬКАМ

**Гэты фотаздымак зроблены ў канцы пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. На ім уся наша сям'я, акрамя старэйшага з дзяцей, Івана, які ў той час знаходзіўся ў камандзіроўцы. Замест сябе для «ўрачыстага моманту» ён дэлегаваў свайго сына Валерку (у другім радзе пасля аўтара гэтых радкоў). Далей ідуць мае браты і сёстры: Коля, Маруся, Ніна, Вася і Сяргей. А ў цэнтры, вядома ж, нашы бацькі, Рыгор Андрэевіч і Тацяна Кірылаўна. Сям'я вялікая, шматдзетная, за якой раз і назаўсёды прыліпла мянушка «Кудлавы». Кудлатыя значыць, кучаравыя, багатыя на заліхвацкія чупрыны ў хлапцоў і прыгожыя косы ў дзяўчат.**



Гляджу на здымак і адчуваю, як сэрца сціскае шчымлівая туга — няма ўжо на гэтым свеце ні бацькоў, ні Сяргея, ні Ніны. І нікуды не падзенешся ад гэтага. Адно што застаецца, дык гэта светлая памяць пра тое, як мы дружна разам з імі крочылі па жыцці, пераадольваючы працьму цяжкасцяў. Ці ж можна, напрыклад, забыць той дзень, калі бацьку на вачах усёй сям'і арыштавалі і змясцілі ў камеру папярэдняга зняволення, дзе некалькі тыдняў жорстка дапытвалі як фашысцкага прыслужніка, спрабуючы «прышыць» яму статус ворага народа.

Ён мужна адстойваў свой гонар, прыводзячы пераканаўчыя аргументы сваёй невінаватасці перад Радзімай і вернага служэння ёй у тых незвычайных абставінах, у якія трапіў не па сваёй волі. Толькі яго ніхто не хацеў слухаць, сцвярджаючы, што ў часы гітлераўскай акупацыі Рыгор Пернікаў загадваў збожжаскладамі ў Чачэрску і такім чынам дапамагаў ворагу. На самай жа справе ўсё было інакш, аб чым ведалі толькі некалькі партызанаў.

Бацьку было 37 гадоў, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Яго выклікалі ў ваенкамат, дзе выдалі вінтоўку, каня з фурманкай, і як работніка раённай канторы па нарыхтоўцы збожжа адправілі ў Засажэўскую зону арганізоўваць калгасы на здачу жыта, ячменю, аўса ды пшаніцы ў дзяржаўныя засекі. Калі ж вяртаўся назад, разбомблены Чачэрск ужо быў захоплены фашыстамі. Перад шлагбаумам яго спынілі і, сарваўшы картуз з галавы, на якой яшчэ не ўвабраліся ў сілу абстрыжаныя валасы, аб'явілі: «Партызан!» Староста, які жыў на нашай вуліцы, не пацвердзіў гэта.

Бацьку загадалі сядзець дома і чакаць выкліку ў камендатуру, дзе потым пад пагрозай расстрэлу сям'і (а нас, дзяцей, тады было ў ёй ужо чацвёра) прымусілі прымаць збожжа з усяго раёна і прывозіць яго да ладу ў складзе, што знаходзіўся на ўскраіне райцэнтра па-над ракой. Адкруціцца ад гэтага не было аніякай магчымасці, і бацька ажывіўся духам, калі аднойчы з партызанскага атрада, што атабарыўся ў засажэўскіх лясах, прыслалі да яго сувязнога з дамовай, каб ён забяспечваў народных мсціўцаў хлебам.

Схема была такая: ноччу яны падганяюць па лузе фурманкі і на лодцы перавозяць прыгатаваныя мяшкі са збожжам. Бацька выдатна разумеў, наколькі гэта была рызыкоўная справа, таму загадзя прыняў адпаведныя меры: адправіў сваю сям'ю і сям'ю брата да знаёмага ў вёску Фундамінка Буда-Кашалёўскага раёна.

Дастаўка збожжа партызанам працягвалася да таго часу, пакуль аднаго разу фашысты не абстралялі іх на рэчцы. Бацьку ж удалося збегчы, і ў тую самую ноч ён пакрыў адлегласць больш чым у дванццаць кіламетраў. Фундамінка была лясной вёскай, якую днём наведвалі немцы, а ноччу — партызаны. І ад першых, і ад другіх бацька быў вымушаны хавацца. Бо фашысты, спаліўшы нашу хату, шукалі яго для расправы. А партызаны гэтай зоны, якія не мелі сувязі з партызанамі-засажэўцамі, ведалі, што Рыгор Пернікаў «камандуе» ў Чачэрску нямецкімі збожжаскладамі, і таксама маглі расправіцца з ім як фашысцкім агентам, засланым у іх атрад.

Калі пачалося вызваленне Гомельшчыны, бацька апынуўся на фронце і, атрымаўшы цяжкае раненне ў баях на Браншчыне, трапіў у ваенны шпіталь, што знаходзіўся пад Гомелем. Вяртанне ж дадому закончылася яго арыштам. Напэўна, не ўдалося б Андрэевічу пазбегнуць высылкі на сібірскія лесапавалы, калі б хтосьці з былых камандзіраў партызанскага атрада, які ваяваў ужо недзе ў Польшчы, не даслаў у Чачэрск на адпаведны запыт такую паперу: «Рыгор Пернікаў — чалавек надзейны, ён дапамагаў партызанам».

Тата наш закончыў царкоўнапрыходскую школу, маці ж не ўмела ні чытаць, ні пісаць. Праца, праца і яшчэ раз праца — вось крэда іх жыцця і метады выхавання дзяцей. Самі яны аддавалі ёй усе сілы і сваім прыкладам заклікалі нас да гэтага. Кожны з дзяцей меў свае канкрэтныя абавязкі з самага маленства і нёс адказнасць за іх выкананне. Я, напрыклад, ужо з сямігадовага ўзросту ў летні перыяд забяспечваў сям'ю рыбай, ловячы яе лазовым кашом, пазней і таптухай. Засцерагаў гусянят ад каршуноў, пазней «шэфстваваў» над меншымі братамі.

А пра збор металу, костак, нарыхтоўку хрэну, лекавых траў, што здавалі ў прыёмныя пункты, перакопку бульбы на калгасным полі пасля яе ўборкі, збор жытнёвых каласкоў ужо і размовы няма. З дзявятага ж класа разам з дарослымі мужыкамі на прыстанях у Чачэрску, Гарадоўцы і Чырвоным Беразе выгружаў баржы з мукой і соллю.

Праз працу бацькі прывівалі нам дысцыпліну, настойлівасць, адказнасць за даручаную справу, вернасць дадзенаму слову, павагу да старэйшых. Невыпадкова ўсе мы без выключэння закончылі хто прафтэхвучылішча, хто тэхнікум, хто інстытут і (не падумайце, што гэта — пахвальба) маем шмат падзяк і ганаровых грамат за добрую працу. За ўсё — дзякуй бацькам!

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ,**
*г. Гомель.*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## СЕЗОН НАРЫХТОВАК

### Кабачкі ў часночным соусе



**Спатрэбіцца:** *кабачкі — 2 кг, часнок — 2 галоўкі, соль — 1 ст. л., цукар — 0,5 шклянкі, алей — 100 г, воцат 9% — 100 мл.*

Кабачкі чысцім ад скуркі і насення, часнок вызваляем ад шалупіны і разбіраем на зубкі.

Кабачкі наразаем кубікамі і дадаём здробнены часнок, соль, цукар і алей. Хай пастаяць так 30 хвілін. Сумесь выкладзіце ў паўлітровыя слоікі, заліце кіпенем і пастаўце ў каструлю з гарачай вадой, на дно якой абавязкова пакладзіце ручнік, для стэрылізацыі. З моманту закіпання стэрылізуйце 20 хвілін, закатайце і ўхутайце на ноч.

### Хрумсткія кабачкі з часнаком і морквай

**Спатрэбіцца:** *кабачкі ачышчаныя — 1 кг, морква — 100 г, часнок — 50 г. Для марынаду: вада — 250 мл, соль — 1 ст. л., цукар — 1/4 шклянкі, алей — 100 мл, воцат 9% — 50 мл.*

Кабачкі наразаем кубікамі. Для марынаду ў ваду трэба дадаць соль, цукар, алей і воцат, сумесь закіпяціць. У кіпячы марынад выкладваем кабачкі, варым 2 хвіліны.

Ачышчаную моркву надзіраем на буйной тарцы, а часнок здрабняем. Дадаём да кіпячых кабачкоў моркву, варым яшчэ 5 хвілін. Дадаём часнок. Раскладаем кабачкі з часнаком і морквай у стэрыльныя слоікі і адразу закатваем.

## ПАКАШТУЙЦЕ!

### Клафуці з вішняй



Клафуці — французскі дэсерт, які аб'ядноўвае ў сабе рысы запяканкі і пірага. Фрукты ў салодкім вадкім яечным цесце, падобным на блінное. Выпякаецца ў формах для запяканак.

***Спатрэбіцца:** 500 г вішань без костачак, 100 г мукі, 30 г растопленага масла + 20 г для змазвання формы, 250 мл малака, 2 яйкі, 3 жаўткі, 100 г цукру, пакуначак ваніліну, дробка солі.*

Для цеста змешваем муку, цукар, яйкі, жаўткі, малако, ванілін, соль, растопленае масла і добра ўзбіваем. Выдатна было б даць цесту пастаяць гадзіны дзве ці нават ноч у халадзільніку, але гэта не абавязкова.

Форму для выпечкі добра змазаць маслам і прысыпаць сумессю мукі і цукру. Выкладваем у форму вішні ў адзін слой і заліваем іх цестам. Выпякаем у духоўцы разагрэтай да 180 °С да залаціста-карычневага колеру каля 40-45 хвілін. Пакуль краі не стануць пышнымі, а кончык нажа, устаўлены ў цэнтр клафуці, не будзе заставацца чыстым. Астуджваем у форме і падаём цёплым або халодным.

## ЗАКОНЫ СТЫЛЮ

### Як выбраць джынсы, якія сядуць ідэальна?

**Правільна падабраныя джынсы закліканы падкрэсліваць плюсы і хаваць недахопы фігуры. Не ведаеце, на чым спыніць свой выбар? Устаньце перад люстэркам і ацаніце вашу фігуру.**

Такім чынам, калі вы...

... **уладальніца шырокіх сцёгнаў** — адмоўцеся ад джынсаў з нізкім поясам. Выбірайце прамыя, злёгку завужаныя мадэлі.

... **маеце паўнаватыя калені** — забудзьцеся пра скіні. Вам больш падыдзе цёмны дэнім.

... **дзяўчына з жывоцікам** — замяніце джынсы з нізкім поясам мадэллю з завышанай ці высокай таліяй. Пры стройных нагах гэта бяспройгрышны варыянт.

... **худзенькая** — вузкія джынсы, у якіх ягадзіцы выглядаюць плоскімі, замяніце на мадэлі, якія надаюць клубам аб'ём.

... **маленькага росту** — забудзьцеся пра джынсы з нізкім поясам, клёш насіце толькі з платформай або абцасамі. Ідэальная мадэль для вас — з завышанай таліяй.



## КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ ДЛЯ СТАЛЯРА

✓ Пры распілоўцы фанеры паверхня яе скалваецца. Каб краі былі гладкімі, намачыце ліст па лініі распілоўвання гарачай вадой.

✓ Пры падгонцы вокнаў рэкамендуецца скарыстацца капіравальнай паперай. Яе закладваюць паміж створкай і аконнай шуфлядай. След пакажа, дзе зацісквае і трэба падгабляваць.

✓ Каб пры свідраванні дробных дэталяў з ліставога матэрыялу яны не пракручваліся, падкладзіце пад іх наждачную паперу.

■ Маміны дзённікі

### «Я ўжо ўвесь прачнуўся»

**Трапілі ў бальніцу. Даня забягае ў палату і крычыць:**

**— Мама, там макароны з сасіскамі едуць!**

☺☺☺

— Мама, ты не хочаш са мной сварыцца? — пытаецца Даня.

— Не, вядома.

Праз пару хвілін.

— Мама, уключы мне мульцік пагладзець.

— Ты ж толькі што глядзеў.

— Бачыш, мама, ты ўжо пачынаеш са мной сварыцца.

☺☺☺

**Сын узяў 2 цукеркі і адну дае мне.**

**— Ведаеш, чаму я ўзяў адразу дзве цукеркі?**

**— ?**

**— Каб ты не прасіла ў мяне пакаштаваць маю.**

☺☺☺

Раніцай сын прачнуўся раней за ўсіх і прыйшоў да бабулі ў ложак.

— Давай яшчэ трохі паляжым, каб да канца прачнуцца, — прапанавала бабуля.

— Я ўжо ўвесь прачнуўся.

☺☺☺

**— Навошта намаляваў на шпалерах?! — лаюся на сына.**

**— Не магу дачакацца, калі пачнецца рамонт, — апраўдваецца ён.**

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

***А пра што гаворыць вашы дзеці? Дасылайце свае гісторыі.***



СЯМ'Я ДАЕ ЧАЛАВЕКУ КАРАНІ, АЛЕ ЯНА ПАВІННА ДАВАЦЬ ЯШЧЭ І КРЫЛЫ (усходняя мудрасць).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

# КАБ ЗАСТУПІЎСЯ ЗА ВАНДРОЎНІКАЎ

## У Мірскім замку асвечана капліца ў гонар святога Хрыстафора

**Гэты невялікі каталіцкі храм у Брамнай вежы замка быў заснаваны і асвячоны ў канцы XVI стагоддзя Мікалаем Хрыстафорам Радзівілам Сіроткам у гонар яго нябеснага заступніка. І вось сёлета, праз 400 гадоў пасля смерці Радзівіла Сіроткі, адрэстаўраваная капліца зноў адчыніла дзверы для вернікаў. Сімвалічна, што ўрачыстасць адбылася 25 ліпеня, у дзень св. Хрыстафора.**

Легенда гаворыць, што святы Хрыстафор быў магутным рымлянінам высокага росту. У пошуках магчымасці служэння Хрысту ён трапіў да старца, які і параіў дапамагаць людзям пераадольваць небяспечны брод на рацэ. Адным з такіх падарожнікаў, перанесеных Хрыстафорам на плячах цераз раку, быў маленькі Хрыстос. За прыхільнасць да хрысціянства волат быў кінуты ў турму мясцовым уладаром, дзе і памёр пакутніцкай смерцю. Але і сёння памяць пра яго жыве, а сам святы лічыцца заступнікам усіх падарожнікаў.

— Рэстаўрацыя і асвячэнне капліцы ў гонар святога Хрыстафора ў Мірскім замку — знакавая падзея для нашай краіны, — лічыць **епіскап Гродзенскай каталіцкай епархіі Аляксандр КАШКЕВІЧ**. — Дзякуючы намаганням многіх людзей гістарычная спадчына выратавана і адноўлена. У гэтай капліцы чалавек будзе мець магчымасць упрыгожыць сваю душу праз малітву. Я вельмі ўдзячны роду Радзівілаў, які пакінуў нашчадкам гэтую цудоўную архітэктурна-духоўную спадчыну. Няхай капліца ўносіць уклад у духоўнае адраджэнне ўсіх людзей, якія будуць наведваць гэты гістарычны аб'ект.

**Дырэктар замкавага комплексу «Мір» Вольга ПАПКО** падчас свята расказала, што рэстаўрацыя капліцы была завершана больш за год таму, але летась урачыстую цырымонію яе асвячэння не змаглі правесці менавіта 25 ліпеня, таму давялося чакаць цэлы год, каб адным вялікім святам аддаць даніну памяці Мікалаю Крыштофу Радзівілу Сіротку, заснавальніку храма, і яго нябеснаму апекуну святому Хрыстафору.

— У мяне ёсць вялікая мара — каб у Міры з'явілася вуліца імя Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, — прызналася Вольга Мікалаеўна. — Так, з аднаго боку такая назва гучала б грувастка, але з іншага — гэты выдатны чалавек, мецэнат, заслугоўвае такой павагі нашчадкаў.

У Міры ёсць легенда: калі пры спрыянні Радзівіла Сіроткі будаваўся касцёл Святога Мікалая, то былі знойдзеныя косці мамантa, сам князь вельмі ганарыўся гэтай знаходкай і, каб пахваліцца, паказваў яе ўсім высокім гасцям. Сёння на сценах Мірскага замка таксама можна пабачыць рогі і капыты бізонаў, канечне, гэта не тыя старажытныя артэфакты, але нагода прыгадаць выдатную гісторыю.

— Крыштофам звалі дзядулю князя Мікалая па лініі маці, але спалучэнне Мікалай Крыштоф ужо пасля смерці Сіроткі 16 разоў паўтаралася ў імёнах прадстаўнікоў роду, насіць гэтае імя было вялікім гонарам, — расказвае Вольга Папко. — У прысвячэнні капліцы святому Хрыстафору ёсць яшчэ адзін сімвалічны сэнс. Гэты святы — апякун падарожнікаў, а наш замак штогод прымае каля 300 тысяч турыстаў. Таму спадзяёмся, што гэты нябесны заступнік будзе дапамагаць вандроўнікам знаходзіць Мірскі замак і што свята 25 ліпеня для Міра стане традыцыйным.



Фота БЕЛТА.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** vesialuha@zviazda.by

# Жыццё — у прафесіі

## У Магілёве напісалі кнігу пра журналістаў

**Дыхтоўнае выданне на 200 старонках прысвечана творчаму і жыццёваму шляху вядомых журналістаў вобласці, пра якіх на працягу 5 гадоў пісала ў сваім праекце «Прафесія — журналіст» абласная газета «Магілёўскія ведамасці». Ідэя аформіць каштоўны матэрыял у кнігу належыць галоўнаму рэдактару інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці» Святлане ШУТАВАЙ. Ініцыятыву падтрымала галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама.**




— Кніга ўнікальная ўжо тым, што моладзь, якая сёння прыходзіць да нас працаваць, зможа даведацца, наколькі адданыя людзі служаць гэтай прафесіі, — кажа Святлана Шутава. — Нашы калегі, прозвішча якіх мы чытаем пад матэрыяламі тых ці іншых выданняў, тут самі расказваюць пра сябе. **Уладзімір КАПУЗА**, акрамя таго, што **рэдактар абласной сельскагаспадарчай газеты «Зямля і людзі»**, а ў былым радыйшчык, яшчэ і выдатны лірычны паэт. Тут жа ёсць інтэрв'ю з Рыгорам Кісялём, які быў першым рэдактарам газеты «Магілёўскія ведамасці», а ў 1994 годзе ўзначаліў новастворaную нацыянальную дзяржтэлерадыёкампанію Беларусі.

Слова на старонках кнігі атрымалі 30 таленавітых газетчыкаў і радыйшчыкаў. Цяпер, калі скончылася эпоха праваднога радыё, асабліва цікава даведацца, чым яно жыло, пазнаёміцца з тымі, чыімі галасамі гаварыла. Гэта своеасаблівы дапаможнік для будучых журналістаў, бо лепшай базы для напісання курсавых і дыпломных пра журналістыку Магілёўшчыны не знайсці.

— Гэта вартае падвядзенне творчага праекта, які доўжыўся 5 гадоў, і наогул унікальнае выданне ў цэлым для краіны, — лічыць **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Алена ДЗІВАКОВА**. — Журналісты пішуць гісторыю нашай Айчыны, але за рэпартажамі, тэле- і радыёсюжэтамі не бачаць саміх аўтараў. Кніга дае добрую магчымасць даведацца пра іх жыццё. Гэты праект абавязкова трэба працягваць, бо таленавітых журналістаў на Магілёўшчыне значна больш.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Андрэй Дзічэнка нарадзіўся ў 1988 годзе ў Калінінградзе ў сям'і вайскоўца. Апошняя акалічнасць і паслужыла прычынай таму (нагадаю, адбывалася гэта яшчэ ў эпоху існавання СССР), што сям'я праз некаторы час пераехала ў Беларусь. Так Андрэй апынуўся ў Вілейцы. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, хоць пасля яго заканчэння свой далейшы лёс вырашыў звязаць з журналістыкай. З яе і пачаўся шлях у літаратуру. І сёння на рахунку Андрэя Дзічэнкі не толькі шматлікія апавяданні, але і раманы. Нешта з напісанага ім зацікаўлены чытач можа знайсці ў папяровым варыянце, нешта ў сеціве. І хоць сам малады пісьменнік у адным з інтэрв'ю неяк прызнаўся, маўляў, далёка не ўсе здольныя дачытаць яго тэксты да канца (сапраўды, не зусім простыя, але, з іншага боку, для многіх тым і прыцягальныя), думаецца, што сярод чытачоў гэтага нумара «Звязды» такія калі і будуць, то яны акажуцца ў меншасці. Гэтаксама як, не сумняваюся, абавязкова знойдуцца тыя, хто захоча пачытаць і іншыя творы Андрэя, дарэчы, аднаго з пераможцаў леташняга конкурсу маладых літаратараў Беларусі і Расіі «Мост дружбы», які праводзіць Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы.**

**Алесь БАДАК.**

Андрэй ДЗІЧЭНКА

# КАНТАКТ

УСЁ дзяцінства Сярожа хварэў на аўтызм. Сам ён дакладнага дыягназу не ведаў, але дарослыя з халоднымі далонямі і зморшчанымі лбамі называлі ўсякія яго дзівацтвы менавіта так. Да 14 гадоў хлопчык быццам бы папраўіўся, але так і не пачаў гаварыць. Лічыць і пісаць Сярожа ўмеў, але ўжываў гэтыя навыкі толькі ў адным выпадку — калі катаўся на грамадскім транспарце.

Многія, хто ведаў Сярожу з дзяцінства, лічылі яго дурным хлапчуком, які застаўся мазгамі на ўзроўні другакласніка. Але гэта меркаванне было ў корані памылковым, бо юны шукальнік ісціны зусім не ўпісваўся ў агульнапрынятыя рамкі чалавечых здольнасцяў. Яму адкрывалася чалавечая сутнасць, ледзь толькі тонкія хударлявыя пальцы дакраналіся да чыёй-небудзь плоці.

З гэтай прычыны ўвесь свой вольны час, які пачынаўся з усходам сонца і заканчваўся ў прыцемках, Сярожа катаўся на маршрутных таксі.

Калі ён выходзіў марознай раніцай на прыпынак, тут жа даставаў з кішэні пакамечанае пасведчанне, завеpанае размытай пячаткай. Дзякуючы гэтаму камяку кардону незвычайны пасажыр ездзіў бясплатна ад аднаго канцавога прыпынку да другога. Амаль усе вадзіцелі маршрутак у горадзе не валодалі рускай мовай, але выдатна ведалі Серджука ў твар. Лічылася, што, калі ён сеў у машыну, ніякіх непрыемнасцяў на дарозе не адбудзецца. Часта вадзіцелі частавалі яго цукеркамі, а бліжэй да ночы адвозілі дадому на ўскраіну горада, каб хлопец не блукаў па цёмных пустых завулках у пошуках сваёй хаты.

Сярожа сядаў на самае першае, часцяком праціснутае сядзенне ў старым салоне аўтамабіля. Рабіў ён гэта для таго, каб перадаваць грошы людзей, якія распаўзліся па мініяцюрным аўтобусе. Дотык да пальцаў незнаёмага чалавека, адчуванне шурпатай купюры ў руках і абыякавыя погляды гарадскіх абывацеляў напаўнялі ўяўленне Сярожы яркімі ўспышкамі. Пра іх ён думаў ужо перад сном, калі надыходзіла важнае пераасэнсаванне пражытага ў прасторы аўтобуса жоўтага колеру, пакрытага інеем бруду.

Зазіраючы ў думкі людзей і даследуючы іх патаемныя жаданні, Сярожа хацеў напасці на след абраных чалавечых арганізмаў. З самага дзяцінства ён уяўляў сабе тысячы ракет, якія ляцелі да планеты з далёкіх светаў і па начах падалі на заснежаныя палі. Ад вогненных кратараў разыходзіліся голыя і стомленыя бязважкасцю людзі. Адны выжывалі, іншыя станавіліся часткай энергіі і ў зусім новым якасным стане вярталіся дадому.

Сярожа хацеў знайсці тых, хто выжыў. Проста таму, што сам быў такім. Ніхто яму пра гэта не казаў, але далёкія светы, у якіх ён не адчуваў сябе ізгоем, ён бачыў у сваіх снах. Там жа яго сабраты глядзелі ў гіганцкія тэлескопы і назіралі за жыццём на берагах акіянаў, якія спантанна ўзніклі на гэтай планеце.

На жаль, многія не разумелі сваёй каштоўнасці і хацелі з ёй скончыць раз і назаўжды, але Сярожа верыў у вялікі сэнс любога жыцця. З мясцовым насельніцтвам ён ніколі не меў зносін звычайным чалавечым маўленнем толькі праз тое, што яго розум не ўмеў гэтага рабіць. Спачатку гэта яго засмучала. Ён кідаўся, нібы быў вольнай птушкай у замкнёным пакоі. Потым жа марны адчай змяніўся абыякавай да ўсяго пакорай. На мяжы 10 і 11 зямных гадоў ён шмат думаў пра тое, што, напэўна, ёсць іншыя спосабы зносін з людзьмі.

Шмат у чым на цудоўныя адкрыцці адоранага хлапчука паўплывала прыёмная маці і яе дотыкі. Калі яна сваімі цёплымі вуснамі цалавала яго ў лоб і гладзіла па густых русых валасах, то нябачныя сонечныя прамяні быццам бы прасвечвалі наскрозь спіну і ногі. Скура пакрывалася мурашкамі, і ад гэтага цела хлопчыка ўскаланалася, а твар міжволі азараўся ўсмешкай.

Аднойчы ў разгар працоўнага дня Сярожа залез у чарговую маршрутку з налётам бруду на шкле. Праз некалькі прыпынкаў насупраць яго села чарнявая дзяўчына з мітуслівым позіркам. Спачатку яна доўга корпалася ў торбачцы, а потым выняла з яе некалькі пакамечаных купюр. Сярожы яна падалася падазронай і занадта ненатуральнай. Ледзь працягнуўшы да яе руку і дакрануўшыся кончыкамі пальцаў да яе плоці, ён раптам адчуў прыліў незвычайных, пазбаўленых логікі рашэнняў.

«Ура! Свае! Ура! Свае! Ура! Свае!» — круцілася некалькі аднолькавых слоў у галаве. Яшчэ крыху — і яны вырвуцца з суцэльнага патоку думак і набудуць уласнае гучанне.

Але пакуль што яшчэ рана.

Дзяўчына пільна глядзіць на спадарожніка. Затым складвае вусны трубачкай і быццам бы цалуе яго нос. Сярожа ў адказ на гэтыя тэлепартацыйныя ласкіківае галавой. Усім сваім выглядам ён дае зразумець, што гатовы да кантакту і менавіта дзеля гэтага наездзіў тысячы кіламетраў па разбітых гарадскіх дарогах. Машына трасецца, метал бразгоча. Людзі ў салоне ўздрыгваюць ад рэзкага тармажэння. А Сярожу радасна на душы.

«Гэта ўсё так падобна да атракцыёнаў у парку».

— І, можа, ты... — яна кажа быццам бы шэптам, але больш ніхто яе не чуе. Толькі два чалавекі.

Дзяўчына бярэ Сярожу за руку і просіць спыніць машыну дзесьці паміж раённым гастраномам і заводам, сцены вакол якога такія высокія, што нават калі расскакацца на батуце, усё роўна не ўбачыш несамавітыя будынкі і брудныя прахадныя.

Яны выйшлі на свежае паветра, развіталіся з маршруткай узмахамі рук і папляліся ўздоўж плота, паверхня якога даўным-даўно парэпалася і нагадвае фантасмагарычныя карты нязведаных светаў у двухмернай плоскасці.

Агінаючы цагляныя дамы, разбітыя дзіцячыя пляцоўкі і проста нічым не забудаваныя пусткі, яны выйшлі на прасторную палянку, у кустах побач пахла гнілым лісцем і гарэлымі лапкамі. Дзяўчына дастала з торбачкі маленькі абрус, на якім белымі і чорнымі ніткамі анамальная швачка выткала зоркі і пустынную касмічную прастору так, быццам яна была якасна іншай.

Паслаўшы абрус на халодную зямлю, новая знаёмая з дакорам паглядзела на Сярожу.

— Пакладзі ўсё, што здольнае цябе тут утрымаць, — і Сярожа ў адказ дастаў з унутранай кішэні адно толькі пасведчанне, наіўна маркуючы, што спадарожніца пазбавіць яго бясконцых пошукаў.

Закруціўшы пасведчанне ў абрус, яна схавала скрутак у сумку. Дзяўчына развіталася з Сярожам, адскочыла ўбок і паспешліва ўцякла ў лес.

Застаўшыся ў адзіноце, Сярожа раптам зразумеў, што ўсё навокал — гэта суцэльны фальш, які здарыўся па вельмі вялікай памылцы. Апантаны думкамі аб адсутнасці рэальнасці, ён пешшу вярнуўся дадому, уразаючыся ў вітрыны крамаў і няветлівых мінакоў.

Неўзабаве вадзіцелі і прыёмная маці перасталі яго пазнаваць. А людзі — і зусім заўважаць яго прысутнасць сярод іх.

Адчуўшы мяжу чалавечай сутнасці, Сярожа замкнуўся і назаўсёды забыўся, як гэта бывае, калі здараецца шчасце.

З іншага ён ператвараўся ў звычайнага. У гэтым і заключалася вызваленне.

БЕЛАРУСБАНК

## «Беларусбанк» запускает новый комплексный продукт – «Свободный выбор»

ОАО «АСБ Беларусбанк» с 1 августа 2016 года вводит новый комплексный продукт «Свободный выбор», который включает в себя **вклад, платежную карточку и овердрафт**.

Срочный безотзывный вклад может быть оформлен на 2 срока – 11 или 24 месяца. По вкладу установлена максимальная процентная ставка в зависимости от срока: 11 месяцев – 20,5% годовых, 24 месяца – 22,5% годовых, что обеспечивает вкладчику получение повышенного дохода.

В период действия депозита, вкладчик может воспользоваться овердрафтом в размере до 50% от остатка вклада на дату оформления заявки по получению овердрафта, без предоставления поручителей.

Ставка овердрафта для владельцев вклада на:

- срок 11 месяцев – (ставка рефинансирования НБ РБ + 7п.п.) годовых.
- срок 24 месяца – (ставка рефинансирования НБ РБ + 9п.п.) годовых.

Одновременно информируем, что в период с 01.08.2016 по 31.10.2016 (включительно) банк проводит акцию по снижению годовой процентной ставки по овердрафту **до ставки рефинансирования НБ РБ + 3 процентных пункта** годовых.

Для удобства проведения расчетов, получения дохода и перечисления остатка вклада при его закрытии, в учреждении банка вкладчику бесплатно оформляется международная платежная **карта БЕЛКАРТ-Maestro на 3 года и Интернет-банкинг**.

